Каб перавесці садовыя домікі ў ранг жылля, трэба спачатку давесці да ладу ўсе адпаведныя стандарты, неабходныя для якаснага функцыянавання сельскага населенага пункта. СТАР 3

«Звязда» аднаўляе традыцыю «выязных прыёмных». Першая з іх прайшла ў Стаўбцоўскім раёне — адным з буйнейшых вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі Мінскай вобласці. СТАР 5

У спартыўным асяроддзі яго даўно называюць «прафесарам» ці проста «профі», і Радзівонаў ужо не раз пацвярджаў сваю мянушку, забіваючы ў вароты «Андэрлехта», «Ліля» і «Баварыі». СТАР 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 САКАВІКА 2013 г. АЎТОРАК № 55 (27420) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

БЕЛАРУСЬ — ААЭ: ПОЎНАЯ ЎЗАЕМАДАПАЎНЯЛЬНАСЦЬ

Беларусь разлічвае на паглыбленне супрацоўніцтва з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі ў розных сферах. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 25 сакавіка на сустрэчы з наследным прынцам эмірата Абу-Дабі — намеснікам вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі сіламі ААЭ шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам.

Фота БЕЛТА.

«Імкненне Рэспублікі Беларусь развіваць адносіны з ААЭ — свядомы выбар і жаданне будаваць паўнацэннае ўзаемадзеянне з дружалюбнай нам дзяржавай. Мы адчуваем аналагічны падыход і з эмірацкага боку», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«У Рэспубліцы Беларусь спадзяюцца, што актыўны палітычны дыялог з ААЭ і далей будзе дынамічна развівацца. Мы нацэлены на паступальны вывад нашых адносін на якасна новы ўзровень узаемадзеяння, які ахопіць усе ключавыя напрамкі ў галіне палітыкі і эканомікі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Шэйх Мухамед бен Заід аль-Нахаян пацвердзіў інтарэс да ўмацавання беларуска-эмірацкіх сувязяў і развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Прэзідэнт Беларусі таксама правёў сустрэчу з намеснікам прэм'ер-міністра — міністрам унутраных спраў ААЭ шэйхам Сейфам бен Заідам аль-Нахаянам. Аляксандр Лукашэнка адзначыў дынамічнае развіццё ААЭ ў розных сферах, у тым ліку ў будаўніцтве, турызме, нафтаздабычы. Гэты вопыт, на думку кіраўніка дзяржавы, можа быць запатрабаваны і ў Беларусі. «У нас узаемадапаўняльныя, не канкурыруючыя адна з адной эканомікі. Мы бачым вялікае поле дзейнасці для нашых кампаній у Эміратах і вялікія сферы прыкладання для вас у Беларусі. Таму калі мы тут перасякаемся, калі гэта выгадна і цікава, мы не павінны страчваць час, мы павінны супрацоўнічаць, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. — Нас задавольвае, што Эміраты ніколі нам не выстаўлялі ніякіх папярэдніх умоў для супрацоўніцтва. Тым больш мы не маем намеру абумоўліваць наша супрацоўніцтва нейкімі палітычнымі ўмовамі».

Паводле слоў Сейфа бен Заіда аль-Нахаяна, ААЭ зацікаўлены ў развіцці супрацоўніцтва з Беларуссю па ўсіх напрамках. «Мы ведаем, што ў Беларусі добра развіты прамысловасць, сельская гаспадарка, іншыя напрамкі, што Беларусь з'яўляецца адным з лідараў сярод краін Усходняй Еўропы па тэмпах росту эканомікі. Мы згодны з вамі ў тым, што трэба ствараць эканамічную базу нашага супрацоўніцтва», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер ААЭ.

«Мы ведаем, што ў 2000-я гады Беларусь развівалася вельмі хуткімі тэмпамі, што ВУП вашай краіны рос прыкладна на 8-9 працэнтаў кожны год. Калі параўнаць з ЗША, то ў іх рост у той жа час складаў 1-2 працэнты. Таму ваш рост быў вельмі высокі, мы ўсё гэта адзначаем», — заўважыў Сейф бен Заід аль-Нахаян.

«Я цалкам згодны з вашымі словамі і прапановамі. У мяне ёсць указанні Прэзідэнта і наследнага прынца па развіцці супрацоўніцтва з вашай краінай, і мы абазначым канкрэтныя праекты, якія зможам выканаць», — дадаў ён.

За кароткі прамежак часу адносіны паміж Беларуссю і ААЭ значна ўмацаваліся. Яны характарызуюцца высокім узроўнем адкрытасці, даверу і актыўнымі палітычнымі кантактамі, што з'яўляецца надзейнай асновай для далейшага развіцця беларуска-эмірацкага дыялогу як у галіне палітыкі, так і эканомікі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДА САРАКОЎ — СОРАК ШПАКОЎНЯЎ

Навучэнцы Гусаркаўскай базавай школы Клімавіцкага раёна Раман БАЗЫЛЕЎ і Аляксандр Свярдлоў разам з настаўнікам Андрэем НОВІКАВЫМ напярэдадні гнездавога перыяду робяць у школьнай майстэрні новыя хаткі для птушак.

ЛІЧБА ДНЯ

Br4 млн 504 тыс. 840

склала налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў лютым 2013 года, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Для параўнання: сёлета ў студзені гэты паказчык быў Br4 млн 368 тыс. 23. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у лютым бягучага года склала Br4 млн 539 тыс. 345 (у студзені 2013-га — Br4 млн 398 тыс. 929).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.03.2013 г.

Долар ЗША	8620,00	▼
Еўра	11210,00	▲
Рас. руб.	280,00	▲
Укр. грыўня	1059,36	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 1°
Віцебск	0°
Гомель	– 5°
Гродна	+ 1°
Магілёў	– 4°
Мінск	– 3°

■ Занятасць

СТАЛІЦЫ НЕ ХАПАЕ РАБОЧЫХ РУК

У Мінску сканцэнтравана амаль чвэрць працоўнага патэнцыялу рэспублікі. Колькасць занятых у эканоміцы горада ў 2012 годзе склала 1.078.100 чалавек. Пры гэтым захоўваецца высокі попыт на працоўную сілу. Колькасць вакансій перавышае колькасць беспрацоўных амаль у 12 разоў — на 2,2 тысячы беспрацоўных умоўна прыходзіцца 25,5 тысячы свабодных працоўных месцаў. Ці ўдасца гораду скараціць гэты дысбаланс? Якія тэндэнцыі прасочваюцца на сталічным рынку працы? Якія прафесіі будуць запатрабаванымі? Разабрацца ў сітуацыі нам дапамагла начальнік упраўлення занятасці насельніцтва Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ.

Праца па-мінску

Больш за 1,5 тысячы арганізацый горада штомесяц інфармуюць службу занятасці аб наяўных вакансіях. Выходзячы з іх заявак, можна сцвярджаць, што да 75% вакансій на мінскім рынку працы прыпадае на працоўныя спецыяльнасці. Найбольшая патрэба ў кадрах захоўваецца ў прамысловасці (22%), будаўніцтве (19%), транспарце і сувязі (15%) і ў гандлі (10%). Пры гэтым Таццяна Кудзевіч адзначае пазітыўныя змены ў галіновай структуры попыту на працоўную сілу. Так, да канца 2012 года знізіўся попыт на рабочую сілу ў будаўніцтве (-16%), дзяржаўным кіраванні (-38%), у адукацыі (-2%).

Тым не менш у ліку найбольш запатрабаваных застаюцца будаўнічыя прафесіі (муляры, маляры, бетоншчыкі, тынкоўшчыкі, слесары, электрыкі, мантажнікі, падсобныя рабочыя), а таксама кіроўцы аўтамабіляў, кандуктары, прадаўцы, прыбіральшчыкі памяшканняў і інш.

Спецыяліст адзначае, што для вырашэння кадравых пытанняў наймальнікамі горада актыўна прыцягваецца замежная рабочая сіла. У 2012 годзе рынак працы Мінска, па ўзгодненні з Камітэтам па працы, занятасці і сацабароне, папоўніўся 7147 замежнымі грамадзянамі — гэта на 46% больш, чым у 2011 годзе. Галоўным чынам, замежныя спецыялісты прыцягваліся ў будаўнічую галіну і сферу паслуг.

...і беспрацоўе

Сярэдні ўзрост беспрацоўнага цяпер складае 36 гадоў (у 2001 годзе — 29 гадоў). Сярод беспрацоўных узрасла доля асоб з вышэйшай адукацыяй (да 26%) у 2001 годзе іх было 16,0%.

Жанчын і мужчын сярод афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных прыкладна пароўну (50,1% складаюць жанчыны, 49,9% — мужчыны).

Цяжэй за ўсё знайсці працу тым, чые спецыяльнасці залішне прадстаўлены на рынку працы (эканамістам, юрыстам, перакладчыкам, журналістам), а таксама людзям з недастатковым узроўнем кваліфікацыі, альбо тым, у каго адсутнічае вопыт работы.

Сярод працадаўцаў існуе канкурэнцыя за рабочыя кадры, і не толькі за кваліфікаваныя.

Далёка не ўсе беспрацоўныя мінчане звяртаюцца ў службу занятасці. Адна з тэндэнцый апошняга часу — скарачэнне зарэгістраванага беспрацоўя. Па дапамогу ў працаўладкаванні прыходзяць у асноўным сацыяльна неабароненыя пласты насельніцтва, якія не могуць працаўладкавацца самастойна: работнікі з нізкай кваліфікацыяй, звольненыя за парушэнне дысцыпліны, інваліды, асобы з месцаў пазбаўлення волі і інш.

❐❐❐

Сярод зарэгістраваных беспрацоўных толькі 60% маюць права на фінансавую дапамогу па беспрацоўі (сярэдні памер яе ў лютым склаў 206 тысяч рублёў). СТАР 2

■ Надвор'е

КРЫХУ СНЕГУ, А ЎНАЧЫ МАРОЗНА

З аўторка па чацвер тэрыторыя нашай краіны будзе пад уплывам зоны павышанага атмасфернага ціску, сфарміраванай у халоднай паветранай масе Скандынавіі, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму чакаецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі ў сераду па паўночным усходзе магчымы невялікі снег, а ў чацвер удзень па захадзе Брэсцкай вобласці пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег.

Сёння ўдзень будзе амаль веснавое надвор'е — ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. А вось у ноч на сераду чакаецца ўжо 8—14 марозу, месцамі нават да 15—20 градусаў ніжэй за нуль. Тэмпература паветра ўдзень ад мінус 4 да плюс 2 градусаў.

У ноч на чацвер стане яшчэ халадней. Прагназуецца мінус 10—16, а месцамі і да 18—23 марозу. Толькі па паўднёвым захадзе ўначы — мінус 5—9 градусаў. Удзень — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе кароткачасовы снег уначы ў заходнія, а ўдзень і ў цэнтральныя раёны Беларусі. Прагназуецца, што па паўднёвым захадзе ў пятніцу снег будзе чаргавацца з дажджом. Тэмпература паветра ў ноч на пятніцу будзе вагацца ад мінус 4 па захадзе да 18 марозу па ўсходзе краіны. Удзень — ад мінус 4 да плюс 4 градусаў. Нейкага веснавога цяпла сіноптыкі пакуль не прагназуюць.

Сяргей КУРКАЧ.

ГЕЕLY ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ

Першая партыя легкавых аўтамабіляў беларуска-кітайскай зборкі, выраблены на СЗАТ «БелДжы» ў Барысаве, паступіла ў продаж у Мінску. Аб гэтым паведаміла БЕЛТА менеджар па сувязях з грамадскасцю СЗАТ «БелДжы» Алена Значанок.

У продаж адпраўлена 16 аўтамабіляў мадэлі Geely SC7. Іх рэалізуе афіцыйны дылер СЗАТ «БелДжы» — ААТ «Аўтагандальсэрвіс». Паміж двума прадпрыемствамі заключана дылерскае пагадненне аб продажах і сэрвісе легкавых аўтамабіляў беларуска-кітайскай зборкі.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ ЎВОДЗІЦЬ ГРАШОВЫ ЗАКЛАД ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

Вялікабрытанія збіраецца ўвесці новыя правілы знаходжання замежнікаў па часовай ўязной візе, згодна з якімі грамадзяне, якія ўязджаюць з «іміграцыйна небяспечных» краін, павінны будуць уносіць грашовы заклад. Як мяркуецца, гаворка ідзе пра тысячу фунтаў стэрлінгаў (1,3 тыс. долараў ЗША), але не выключана, што гэтая сума будзе большай. Таксама разглядаецца варыянт прызначэння памеру дэпазіту ў кожным канкрэтным выпадку. Грошы паступяць на спецыяльны дзяржаўны рахунак — законапаслухмяныя турысты атрымаюць іх назад пры выездзе. Пры перавышэнні вызначанага візай тэрміну знаходжання ў краіне заклад канфіскуюць на карысць дзяржавы.

ПАЛІЦЫЯ АБВЯСЦІЛА ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ РАССЛЕДАВАННЯ СМЕРЦІ БЕРАЗОЎСКАГА

Брытанская паліцыя не выявіла ніякіх сведчанняў таго, што да смерці расійскага алігарха Барыса Беразоўскага мог мець дачыненне хто-небудзь, акрамя яго самога і чалавека, які знайшоў цела. Пра гэта паведамляецца ў прэс-рэлізе паліцыі акругі Тэмзвэлі. Паводле паказанняў чалавека, які знайшоў цела Беразоўскага — яго супрацоўніка, як мяркуецца, целаахоўніка, — апошні раз ён бачыў яго жывым каля 22.30 па мясцовым часе 22 сакавіка. Удзень 23 сакавіка супрацоўнік западозрыў нядобрае, бо Барыс Беразоўскі доўга не з'яўляўся ў доме, і выламаў замкнутыя знутры дзверы ваннага пакоя, дзе і знайшоў на падлозе цела. Пасля гэтага ён патэлефанаваў у «хуткую». Урач «хуткай дапамогі» канстатаваў смерць. Калі ён прыбыў на месца здарэння, у яго спрацаваў індывідуальны дазіметр, у сувязі з чым дом быў ачэплены і правераны брыгадай спецыялістаў па хімічнай, біялагічнай і радыелагічнай абароне. Нічога падазронага яны не выявілі. Ніякіх версій аб прычынах смерці паліцыя пакуль не агучвае.

ЕЎРАГРУПА ПАЦВЕРДЗІЛА ВЫДЗЯЛЕННЕ КІПРУ 10 МІЛЬЯРДАЎ ЕЎРА

Міністры фінансаў краін еўразоны (Еўрагрупа) на пасяджэнні, якое прайшло ў ноч на 25 сакавіка, пацвердзілі выдзяленне Кіпру стабілізацыйнага крэдыту памерам 10 мільярдаў еўра. Як заявіў кіраўнік Еўрагрупы Ерун Дэйселблум, другім важным вынікам пасяджэння стала рашэнне аб рэструктурызацыі другога буйнога банка Кіпра Laiki Bank (Народны банк) і аб выдзяленні Кіпру 10 мільярдаў еўра. Рахункі ў Laiki Bank, на якіх ляжыць да 100 тысяч еўра, па законах Еўрасаюза застрахаваны і будуць пераведзены ў Банк Кіпра. Рахункі звыш 100 тысяч будуць часова замарожаны і абкладзены падаткам, які, па непацверджаных звестках, можа скласці да 40%. Пры гэтым рахункі ўсіх астатніх банкаў Кіпра не будуць абкладзены падаткам.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У «СОЎ» БОЛЬШ ШАНЦАЎ РАЗБАГАЦЕЦЬ, А Ў «ЖАЎРУКОЎ» — СТАЦЬ ЧЫНОЎНІКАМІ

Іспанскія навукоўцы праверылі прымаўку «хто рана ўстае — таму Бог падае» і пераканаліся, што ў сучасным свеце вядомае выслоўе не надта актуальнае. Пратэсціраваўшы 1000 падлеткаў, даследчыкі з універсітэта Мадрыда высветлілі, што «совы» часта пераўзыходзяць «жаўрукоў» інтэлектуальна, а таму могуць разлічваць на больш прэстыжную працу і, адпаведна, больш высокую зарплату. Большасць з іх моцныя ў індуктыўным мысленні, якое лічыцца паказчыкам агульнага інтэлекту і акадэмічнай паспяховасці. Акрамя таго, індуктыўнае мысленне часта звязваюць са здольнасцю вынаходзіць і прыдумляць нешта новае, а людзі з такімі якасцямі часта атрымліваюць прэстыжную працу, адзначае The Daily Mail.

■ Дыскусія

ВОПЫТ І ЎРОКІ ГІСТОРЫІ:

БНР як нацыянальная форма беларускай дзяржаўнасці

«Грамадзянін Рэспублікі Беларусь» — кажам пра сябе мы, яе жыхары. Кажам і не задумваемся часта пра тое, з чаго і як утваралася гэтая рэспубліка. Дзе быў той самы вызначальны момант, калі людзі маглі перастаць сябе лічыць проста насельніцтвам нейкай абстрактнай тэрыторыі. Калі яны змаглі перастаць сарамліва гаварыць пра сябе «мы — тутэйшыя». Калі нехта паставіў пытанне пра тое, каб насельніцтва з годнасцю магло называць сябе народам. І варта азірнуцца назад. Варта ўзгадаць той невялічкі перыяд у гісторыі гэтага асобнага — у чым сёння няма сумневу — народа, калі яго «тутэйшасць» была заменена дзяржаўнасцю. Амаль сто гадоў таму ў нашай гісторыі быў момант, які дагэтуль яшчэ можа быць цалкам не ўсвядомлены ўсім нашым грамадствам як лёсавызначальны, калі нацыя заявіла пра сябе праз спробу ажыццяўлення дзяржаўнасці. І галоўнае тут: заявіла. Каб праз нейкі час, у больш спрыяльных умовах, ідэя стала рэальнасцю — у выглядзе незалежнай Рэспублікі Беларусь. Каб павярнуць грамадзян Беларусі да гісторыі, даўшы ім чарговы раз адчуць гонар за свой народ, у рэдакцыі газеты «Звязда» сабраліся гісторыкі, філосафы, палітолагі на «круглы стол», які праводзіцца газетай па ініцыятыве Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Інстытута гісторыі НАН Беларусі. СТАР 6

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ваенныя ВНУ чакаюць

Пытанні ваеннай адукацыі і кадравага забеспячэння Узброеных Сіл абмяркоўваліся на традыцыйнай прэс-канферэнцыі Міністэрства абароны Беларусі напярэдадні ўступнай кампаніі ў ваенныя ВНУ краіны.

— Сёння ў рэспубліцы сфарміравана і паспяхова функцыянуе сістэма падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў, якая дазваляе рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для Узброеных Сіл практычна па ўсім спектры спецыяльнасцяў, — зазначыў **начальнік управлення ваеннай адукацыі Узброеных Сіл палкоўнік Генадзь ЛЯПЕШКА.** — Айчынныя ваенныя навучальныя ўстановы прадстаўлены Ваеннай акадэміяй Рэспублікі Беларусь, 7 ваеннымі факультэтамі і 4 ваеннымі кафедрамі грамадзянскіх устаноў адукацыі.

Асноўнай ваеннай навучальнай установай у нашай краіне з'яўляецца Ваенная акадэмія. Менавіта тут сканцэнтраваны вядучыя ў ваеннай справе спецыялісты, ключавыя ваенна-навуковыя школы і касцяк навуковых супрацоўнікаў вышэйшай кваліфікацыі. У галоўнай ваеннай ВНУ вядзецца падрыхтоўка афіцэраў больш чым па 70 спецыяльнасцях, кірунках спецыяльнасцяў і спецыялізацыях. На базе Ваеннай акадэміі створана 7 факультэтаў, на якіх ажыццяўляецца падрыхтоўка афіцэраў тактычнага звяна. Акрамя таго, ва ўстанове адукацыі рыхтуюцца афіцэрскія кадры для ўнутраных войскаў МУС.

На ваенных факультэтах іншых ВНУ падрыхтоўка будучых афіцэраў вядзецца больш чым па 20 спецыяльнасцях, кірунках спецыяльнасцяў і спецыялізацыях.

— Акрамя таго, атрымаць ваенную адукацыю можна ў Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, дзе мы рыхтуем спецыялістаў пракурорска-следчай дзейнасці, і ў Камандна-інжынерным інстытуце Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, дзе навучаюцца спецыялісты па папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, — дабавіў Генадзь Ляпешка.

У межах пагаднення аб падрыхтоўцы ваенных кадраў для дзяржаў — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, падрыхтоўка ваеннаслужачых для беларускай арміі ажыццяўляецца і ў ваенна-навучальных установах Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. У 2013—2014 навучальным годзе плануецца арганізаваць падрыхтоўку афіцэрскіх кадраў у 11 расійскіх ваенных ВНУ па 24 спецыяльнасцях, кірунках спецыяльнасцяў і спецыялізацыях.

Як паведаміў начальнік управлення ваеннай адукацыі Узброеных Сіл, Міністэрствам абароны сумесна з Міністэрствам адукацыі завяршаецца работа па аптымізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі I ступені. У межах гэтай работы ажыццяўляецца распрацоўка адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі I ступені трэцяга пакалення.

Летась адбыўся пераход на дыферэнцаваныя тэрміны атрымання вышэйшай адукацыі I ступені, змяніліся і тэрміны падрыхтоўкі ваенных кадраў. Напрыклад, падрыхтоўка спецыялістаў у Ваеннай акадэміі па камандным профілі замест 5 гадоў склала 4, а ў Мінскім дзяржаўным вышэйшым авіяцыйным каледжы падрыхтоўка спецыялістаў скарочана з 5,5 да 5 гадоў.

— Мы ідзём у нагу з агульнай сістэмай адукацыі Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў Генадзь Ляпешка. — Таму распрацоўкі Міністэрства адукацыі на зніжэнне тэрміну атрымання вышэйшай адукацыі вядуць да паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

На ваенным факультэце БДУІРа сёлета ўпершыню будзе праводзіцца набор курсантаў па спецыяльнасці «Інфакамунікацыйныя тэхналогіі» па спецыялізацыі «Сістэмы тэлекамунікацый спецыяльнага прызначэння» з тэрмінам падрыхтоўкі 4,5 года і па спецыяльнасці «Радыётэхніка» па кірунку спецыяльнасці «Спецыяльныя сістэмы радыёлакацыі і радыёнавігацыі» з тэрмінам падрыхтоўкі 4,5 года. На ваенным факультэце Мінскага дзяржаўнага вышэйшага авіяцыйнага каледжа адкрыецца новая спецыяльнасць «Беспілотныя авіяцыйныя комплексы дзяржаўнай авіяцыі» па спецыялізацыі «Тэхналагічная эксплуатацыя беспілотных авіяцыйных комплексаў» з тэрмінам падрыхтоўкі 5 гадоў.

Яшчэ адно новаўвядзенне. Раней папярэдні прафесійны адбор уключаў у сябе і праверку ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці абітурыентаў. Сёлета фізічная падрыхтаванасць будзе праверана толькі на заключным этапе прафесійнага адбору.

Вераніка КАНЮТА.

СТАЛІЦЫ НЕ ХАПАЕ РАБОЧЫХ РУК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як патлумачыла Таццяна Кудзевіч, у назначэнні дапамогі па беспрацоўі можа быць адмоўлена ў наступных выпадках: спыненне працоўнага дагавора, заключанага на нявызначаны тэрмін, па ўласным жаданні, пагадненні бакоў, альбо спыненне працоўнага дагавора па падставах, прадугледжаных пунктамі 4, 5, 7 — 9 арт . 42, пунктам 5 арт. 44 і артыкулам 47 Працоўнага кодэкса Беларусі, а таксама звальненне (адлічэнне) за парушэнне воінскай (вучэбнай) дысцыпліны, страта (адсутнасць) крыніцы даходу ў выніку незаконных дзеянняў.

У краіне сёлета на 1 сакавіка на ўліку па беспрацоўі стаяла 26,2 тысячы чалавек. Гэта на 16,8% менш, чым на 1 сакавіка 2012 года. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 0,6% да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва.

Многія мінчане могуць самі знайсці працу і рэалізаваць сябе. Для гэтага ў Мінску рэгулярна праводзяцца кірмашы вакансій і «дні прадпрыемстваў», якія арганізуе служба занятасці.

У свабодным доступе для людзей, якія шукаюць працу, ёсць інфармацыйныя рэсурсы ў аддзелах працаўладкавання, а таксама агульнагарадская электронная база вакансій на сайце Мінгарвыканкама. Дарэчы, толькі за студзень-люты гэтага года зафіксаваны 33.401 зварот да электронных інфармацыйных рэсурсаў у аддзелах працаўладкавання і 2.158.353 звароты — да агульнагарадской электроннай базы вакансій.

ЁСЦЬ ТАКАЯ ТЭНДЭНЦЫЯ...

У цэлым, у 2013 годзе сталічны рынак працы, паводле прагнозаў спецыялістаў, будзе фарміравацца ва ўмовах:

✓скарачэння колькасці працаздольнага насельніцтва;

✓высокага попыту на працоўную сілу і старэння кадраў;

✓росту канкурэнцыі на ўнутраным і знешнім рынку працы;

✓колькаснага і прафесійна-кваліфікацыйнага дысбалансу паміж попытам эканомікі на кадры і іх наяўнасцю на рынку працы;

✓мадэрнізацыі вытворчасцяў і аптымізацыі колькасці працуючых;

✓наяўнасці значнай колькасці грамадзян з нізкай канкурэнтаздольнасцю на рынку працы, якія маюць патрэбу ў дадатковых гарантыях занятасці (інваліды, моладзь, жанчыны, грамадзяне, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі).

Ці можна скараціць дысбаланс на рынку працы? Гэтаму, па словах Таццяны Кудзевіч, можа спрыяць удасканаленне структуры падрыхтоўкі кадраў, аптымізацыя залішняй колькасці ў выніку ўкаранення высокапрадукцыйных і працазберагальных тэхналогій, удасканаленне формаў арганізацыі працы, укараненне гнуткіх формаў занятасці.

У адпаведнасці з законам «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь», наймальнікі абавязаны пісьмова апавяшчаць органы па працы, занятасці і сацабароне аб наяўнасці свабодных рабочых месцаў на працягу двух тыдняў з дня іх утварэння. Паводле Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, непаведамленне службы занятасці аб наяўнасці вакансій цягне накладанне штрафу ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — да 100 базавых велічынь.

ПРАФЕСІІ, НА ЯКІЯ БУДЗЕ ПОПЫТ

Прагноз, падрыхтаваны Бюро статыстыкі рынку працы ЗША, паказвае, што попыт у агляднай будучыні будзе вызначацца 2 тэндэнцыямі: старэннем насельніцтва і распаўсюджваннем інфармацыйных тэхналогій.

Навукова абгрунтаваных распрацовак па дынаміцы прафесійнага складу ў Беларусі не праводзілася. Разам з тым, як адзначае начальнік упраўлення занятасці насельніцтва Камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама, улічваючы асаблівасці беларускага рынку працы, а таксама некаторыя падобныя з Расіяй тэндэнцыі ў навуковым, эканамічным і сацыяльным развіцці, можна вылучыць прафесіі, якія будуць асабліва запатрабаванымі ў будучыні.

Гэта, у першую чаргу, ІТ-спецыялісты. А таксама работнікі ў радыёэлектроннай, оптыка-механічнай прамысловасці, прыборабудаванні.

Удасканаленне будаўнічага комплексу Беларусі будзе заснавана на стварэнні і ўкараненні новых матэрыялаў, энергазберагальных тэхналогій, будаўніцтве экалагічна энергаэфектыўных будынкаў новага тыпу. У сувязі з паўсюдным укараненнем тэхналогій «сухога будаўніцтва» ў будучыні з'явіцца вялікая патрэба ў майстрах па «сухой» апрацоўцы. Будуць запатрабаванымі мантажнікі гіпсакардонных і каркасна-абшываных канструкцый, спецыялісты па сценавых панэлях.

У сувязі з пашырэннем сферы абслугоўвання ўзнікне вялікая патрэба ў работніках гасцінічнага сэрвісу з веданнем замежных моў. Развіццё сферы гандлю запатрабуе пашырэння пераліку прафесій і спецыяльнасцяў і іх напаўненне новымі функцыямі (спецыяліст па закупцы адзення для гандлёвых цэнтраў, буцікаў, магазінаў, кансультант па стылі, модзе, спецыяліст па прасоўванні якога-небудзь тавару або паслуг фірмаў, якія займаюцца вытворчасцю паслуг (рэкламных, творчых і г.д.), спецыяліст, які адказвае за вонкавы эстэтычны і прыгожы выгляд прадуктаў (гародніна, мясныя прадукты, рыба, ікра і г.д.) пры размяшчэнні іх на вітрыне і інш.

У сферы банкаўскіх паслуг будуць запатрабаваны наступныя спецыялісты:

— Спецыяліст па крэдытаванні ў банку (крэдытны брокер);

— Трэйдар — спецыяліст па біржавых таргах (каштоўнымі паперамі, валютай, каштоўнымі металамі);

У сферы страхавання і працы з нерухомасцю з'явяцца новыя прафесіі:

— Андэррайтар — спецыяліст па страхаванні;

— Дэвелапер — спецыяліст па аперацыях з нерухомасцю, які займаецца пакупкай нерухомасці, распрацоўкай праекта і далейшым продажам або здачай у арэнду аб'екта.

Інтэграцыя рэспублікі ў сусветны рынак запатрабуе прафесійных лагістыкаў (спецыялістаў па дастаўцы (перавозцы) і складзіраванні тавараў).

У сферы харчавання з'явіцца патрэба ў такіх спецыялістах, як рэстаратар (спецыяліст рэстараннага сэрвісу) і самелье (спецыяліст па вінах).

У сувязі з развіццём турызму будуць неабходны спецыялісты з добрай адукацыяй па арганізацыі пазнавальнага, экалагічнага, аграэкатурызму, дзелавога, рэлігійнага і іншых відаў турызму, а таксама арганізатары экскурсійнага абслугоўвання.

і яшчэ з-за старэння насельніцтва Беларусі і неабходнасці догляду састарэлых, хворых людзей павялічыцца патрэба ў сядзелках, сёстрах міласэрнасці.

Святлана БУСЬКО.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ

УЗДА РЫХТУЕЦЦА ДА «ДАЖЫНАК»

Больш за 220 млрд рублёў будзе накіравана на будаўніцтва і добраўпарадкаванне аб'ектаў, інфраструктуры Уздзенскага раёна. Абумоўлена гэта правядзеннем тут сёлета абласнога фестывалю працаўнікоў сяла «Дажынкі».

Па словах губернатара Міншчыны Барыса Батуры, для арганізацыі свята хлебаробаў райцэнтр выбраны невыпадкова. Менавіта Узда па ўзроўні добраўпарадкавання і наяўнасці аб'ектаў сацыяльнай і культурнай сферы адстае ад іншых раённых гарадоў. Перш за ўсё ў райцэнтры плануецца пабудаваць Дом культуры і добраўпарадкаваць плошчу і сквер. Мяркуецца таксама капітальна адрамантаваць два жылыя дамы і фасады яшчэ трынаццаці. Будуць добраўпарадкаваны шэсць вуліц, уведзены ў эксплуатацыю два жылыя дамы, а таксама сацыяльны дом.

Вялікі комплекс мерапрыемстваў прадугледжаны па навядзенні парадку на зямлі, добраўпарадкаванні аб'ектаў сельскай гаспадаркі, механічных двароў, рэканструкцыі фермаў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ПАКУЛЬ САКАВІК У АДПАЧЫНКУ...

Моцныя снегапады і завірухі, якія прайшлі па поўдні краіны, прымусілі ўсе службы Гомельшчыны працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. Рух па дарогах быў вельмі ўскладнены. Асабліва цяжка прыйшлося жыхарам Лоеўскага, Брагінскага і Хойніцкага раёнаў.

Дарогі расчышчалі сіламі спецтранспарту дарожных і камунальных службаў, сельскагаспадарчых і іншых прадпрыемстваў. Супрацоўнікі ДАІ рэгулявалі паток транспарту на асабліва складаных участках, аказвалі дапамогу ўсім, хто захрас у снезе, дапамагалі адбуксіраваць машыны з паломкамі. За тыдзень выратавальнікі дапамаглі выцягнуць са снегу 16 транспартных сродкаў. У іх ліку пад Гомелем — расійскі аўтобус з трыццаццю пасажырамі, які рухаўся з Адэсы ў Санкт-Пецярбург, і дзве машыны «хуткай дапамогі».

Фота БЕЛТА.

З-за складанага дарожнага становішча на трасах, якія вядуць ва Украіну, на пункце пропуску «Новая Гута» спынілася каля паўсотні грузавых аўтамабіляў, якія не рызыкнулі выязджаць у непагадзь. Па словах прэс-сакратара гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслана Габрылёва, моцныя снегапады і завея не адбіліся на працы камунальнай інфраструктуры паўднёва-ўсходняга рэгіёна краіны. У дыспетчарскую службу ўпраўлення не паступіла ніводнага паведамлення пра выпадкі спынення падачы энергазабеспячэння або абвальванні пад цяжарам снегу даху будынкаў. Зараз працягваюцца работы па расчыстцы ад снегу дарог, якія апрацоўваюцца супрацьгалалёднымі матэрыяламі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У ШКОЛУ — ПА ПРОПУСКУ

У школу ці гімназію Пінска цяпер можна зайсці даросламу чалавеку толькі па пропуску. Пропускі выдалі бацькам вучняў або сваякам, якія забіраюць ці прыводзяць малодшых школьнікаў.

Дакумент трэба паказаць вахцёру на ўваходзе. Пакуль гэтае мера названа часовай. Яе ўвядзенне абумоўлена павелічэннем крадзяжоў. У дзяцей сталі прападаць рэчы і мабільныя тэлефоны, у настаўнікаў — грошы. А нядаўна быў асуджаны былы настаўнік. 28-гадовы мужчына прыходзіў у школу пад выглядам сустрэчы з былымі калегамі. Такім чынам за месяц ён здзейсніў 11 крадзяжоў. У ліку пацярпелых як настаўнікі, так і вучні. Былы педагог атрымаў два гады абмежавання волі — так званай «хіміі». А ў школах прыняты дадатковыя захады абароны ад зладзеяў.

БУСЛЫ ПРЫЛЯЦЕЛІ... І ЗНОЎ ПАЛЯЦЕЛІ

На Брэстчыну вяртаюцца пералётныя птушкі. Арнітолагі зафіксавалі кулікоў, жураўлёў, буслоў.

Некалькі буслоў прыляцелі ў свае гнёзды ў вёску Падлессе-Радваніцкае, побач з Брэстам. Але птушкі, відаць, не чакалі, што радзіма сустрэне іх снегам, марозам, бяскорміцай. Потым буслы недзе зніклі з вёскі. Спецыялісты гавораць, што птушкі, хутчэй за ўсё, пераляцелі кіламетраў на 40-50 на поўдзень, дзе цяплей. Там яны перачакаюць холад і вернуцца.

Яна СВЕТАВА.

ДАМА «Ў ЧОРНЫМ» «ПАЙШЛА» НА АБМЕННІК

У Мінску абрабаваць пункт абмену валюты спрабавала... жанчына.

Разбойны напад на абменнік Беларускага народнага банка, размешчаны па вуліцы Няміга, 12, быў учынены ў мінулую пятніцу. Паводле інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, жанчына на выгляд гадоў 35-ці, хударлявага целаскладу і ростам каля 165 сантыметраў, якая была апранута ў чорную балоневую куртку да кален з капюшонам, чорную шапку, чорныя штаны і чорныя боты і мела пры сабе чорную жаночую сумку з надпісам, зайшла ў абменны пункт. Скарыстаўшыся тым, што касір якраз адчыніла сваё памяшканне, запіхнула яе назад і пад пагрозай пярцовага балончыка запатрабавала грошы. Аднак касір аказала актыўнае супраціўленне і налётчыцы давялося ўцячы. Зараз даму «ў чорным» вышукваюць. За дапамогу абяцана ўзнагароджанне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПОСПЕХ БЕЛАРУСАЎ У НІДЭРЛАНДАХ

Віцебскія юныя алімпійцы паспяхова выступілі на юбілейных міжнародных спаборніцтвах па скачках на батуце «Кубак кветак», якія адбыліся ў Нідэрландах.

— У XX міжнародных спаборніцтвах «Aalsmeer Flowers Cup» («Кубак кветак») бралі ўдзел каля 320 спартсменаў з 24 краін Еўропы і Амерыкі, — паведамілі ў Віцебскай спартыўнай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву №2. — Выхаванец нашай школы, 16-гадовы Арцём Смірноў, заняў 2 месца ў сваёй узроставай групе (Class 1 Boys). 15-гадовая Наталля Грукава ва ўзроставай групе Class 1 Girls спынілася за крок ад п'едэстала. З Наталляй сапернічалі больш за 70 спартсменак. 13-гадовы Мікіта Ільіных стаў самым юным удзельнікам фіналу і змагаўся за прызавыя месцы нароўні з 16-гадовымі спартсменамі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВЫНЕСЕНЫ ПРЫГАВОР ЯЎГЕНУ ПОЛУДНЮ

Ваенная калегія Вярхоўнага суда прыгаварыла былога намесніка міністра ўнутраных спраў Беларусі, экс-начальніка міліцыі грамадскай бяспекі Яўгена Полудня да трох з паловай года пазбаўлення волі, перадае БЕЛТА.

У прыгаворы сказана, што пакаранне павінна быць адбыта ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

Суд прызнаў Я. Полудня вінаватым па ч. 3 арт. 424 («Злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі»), а таксама па ч. 3 арт. 426 («Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў»). Пры гэтым з былога намесніка міністра знялі абвінавачанне па ч. 3 арт. 430 («Атрыманне хабару») КК Беларусі.

Акрамя таго, суд пастанавіў пазбавіць Яўгена Полудня спецыяльнага звання палкоўніка міліцыі запасу, а таксама канфіскаваць маёмасць асуджанага і пазбавіць яго права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых абавязкаў пры выкананні функцый прадстаўніка ўлады тэрмінам на 5 гадоў. Акрамя таго, Я. Полудзень павінен кампенсаваць каля Br9 млн.

Таксама суддзя ўчора паведаміў, што Я. Полудзень праходзіў службу ў органах унутраных спраў з чэрвеня 1982 года па студзень 2012-га. Пад вартай ён знаходзіцца з 8 снежня 2011 года. Прыгавор не падлягае абскарджанню ў касацыйным парадку.

■ Абітурыент—2013

Рэгістрацыя на прафесійную гутарку выходзіць на фінішную прамую

Для таго, каб зарэгістравацца для праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі, у абітурыентаў застаюцца лічаныя дні. Нагадаем, што рэгістрацыя афіцыйна заканчваецца 31 сакавіка. Але паколькі 31 сакавіка прыпадае сёлета на нядзелю, то фактычна апошні дзень рэгістрацыі — субота 30 сакавіка.

Папярэдні прафадбор праводзіцца пры паступленні на 10 спецыяльнасцяў, дзе да будучых спецыялістаў дзяржавай прад'яўляюцца асаблівыя патрабаванні. У гэты пералік увахо-дзяць спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне», «Дзяржаўнае кіраванне і права», «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «Міжнародныя адносіны», «Міжнароднае права», «Правазнаўства», «Эканамічнае права», «Журналістыка», «Міжнародная журналістыка» і «Мытная справа». Варта мець на ўвазе, што праз папярэдні прафадбор павінны прайсці ўсе, хто плануе паступаць на дзённую, вячэрнюю, завочную і дыстанцыйную формы навучання, на паралельнае навучанне, навучанне ў скарочаныя тэрміны, на навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, для атрымання другой і наступнай вышэйшай адукацыі як за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, так і на ўмовах аплаты фізічнымі і юрыдычным асобамі. Гэта тычыцца і абітурыентаў прыватных ВНУ.

Амаль ва ўсіх ВНУ, на базе якіх праходзіць рэгістрацыя, у першыя два тыдні назіралася зацішша, але бліжэй да заканчэння рэгістрацыі абітурыенты актывізаваліся. Між іншым, змяншэнне колькасці выпускнікоў беларускіх школ усё ж такі адаб'ецца на рэгістрацыйнай статыстыцы — у гэтым амаль ніхто ўжо не сумняваецца. Як і ў тым, што абсалютная большасць удзельнікаў прафесійна-псіхалагічнай гутаркі з поспехам пераадолеюць гэтае выпрабаванне. Самым няўдалым для абітурыентаў аказаўся 2009 год, калі рэкамендацыю па выніках гутаркі не атрымалі 23 чалавекі, а затым гэта лічба пастаянна змяншалася. Напрыклад, у БДУ і БДЭУ летась нікому не адмовілі ў выдачы рэкамендацый. Менавіта таму многія і не разумеюць сэнсу гэтай вельмі працаёмкай і нятаннай працэдуры. Аднак у галоўным адукацыйным ведамстве краіны ўпэўнены ў карысна-сці прафесійна-псіхалагічнай гутаркі, якая дазваляе абітурыентам загадзя ацаніць правільнасць выбару будучай прафесіі. Маўляў, для таго гутарка і праводзіцца, каб абітурыенты яшчэ да афіцыйнага старту прыёмнай кампаніі пацікавіліся спецыфікай будучай спецыяльнасці, суаднеслі свае імкненні і планы з выбранай прафесіяй, умацавалі альбо, магчыма, адмовіліся ад свайго не да канца прадуманага рашэння. Дарэчы, на сайце любога пункта рэгістрацыі і правядзення гутаркі можна знайсці як падрабязныя інструкцыі для абітурыентаў, так і пералік прыкладных пытанняў, якія будуць цікавіць камісію...

Надзея НІКАЛАЕВА



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Погляд

ДЭПАЗІТ З КАНФІСКАЦЫЯЙ: ВОПЫТ КІПРА

Еўразону працягваюць узрушваць катаклізмы. Услед за Грэцыяй, Італіяй і Іспаніяй у цяжкую паласу развіцця ўвайшоў Кіпр. Краіна з насельніцтвам у мільён чалавек апынулася ў вельмі складаным становішчы — грэчаскі крызіс вельмі сур'ёзна ўдарыў па кіпрскай фінансавай сістэме, цесна звязанай з грэчаскай. Праблемы з грэчаскімі банкамі прывялі да праблем з кіпрскімі. Летась краіна была вымушана пазычаць вялікія сумы для пераадолвання банкаўскага крызісу, але сітуацыя толькі пагаршалася. У выніку ў сакавіку пытанне выжывання эканомікі краіны стала рубам. Патэнцыйныя крэдыторы, а гэта міністры фінансаў краін еўразоны (Еўрагрупа), а таксама ЕЦБ, Еўракамісія і МВФ заявілі, што новы крэдыт, без якога краіна не зможа выйсці з фінансавага піке, будзе дадзены толькі ў тым выпадку, калі ўлады Кіпра змогуць самастойна адшукаць 4—5 мільярдаў еўра. І, паколькі ў распараджэнні ўрада не аказалася ніякіх актываў, здольных прынесці такую суму, яму было прапанавана атрымаць гэтыя грошы нетрывіяльнымі спосабамі. А менавіта, пры дапамозе ўвядзення падатку на дэпазіты ў кіпрскіх банках.

Тут жа варта адзначыць, што кіпрскія банкі не зусім звычайныя ў параўнанні з іншымі банкамі ЕС. Доўгія дзесяцігоддзі Кіпр развіваў эканоміку пры дапамозе афшорнага банкінгу, прыцягваючы замежныя капіталы на ўмовах ананімнасці. Гэта дазваляла замежным укладчыкам ухіляцца ад выплаты падаткаў у сябе на радзіме, або папросту трымаць у кіпрскіх банках грошы, крыніцы з'яўлення якіх было б цяжка растлумачыць падатковай інспекцыі ва ўласнай краіне. У сувязі з гэтым няцяжка зразумець, што Еўрагрупа не адчувала сімпатыі да кіпрскіх банкаў, паколькі ў гэтыя банкі выводзілі свае капіталы ў тым ліку і жыхары краін Еўрагрупы. Немалыя багацці прывыклі з 1990-х гадоў захоўваць у кіпрскіх банках і жыхары Расіі — па тых жа прычынах. Менавіта таму патэнцыйныя крэдыторы прапанавалі ўраду Кіпра варыянт з падаткам на дэпазіты ў кіпрскіх банках, каб нанесці сур'ёзны ўрон кіпрскаму банкінгу і за кошт замежнікаў вырашыць цяперашнія праблемы ўрада з недахопам грошай. Можна чакаць, што прычынай такога нетрывіяльнага рашэння, якое не прапаноўвалася пры вырашэнні праблем банкаў у Грэцыі, сталі і традыцыйныя ў многіх краінах ЕС антырускія настроі. Ад абкладання дэпазітаў у кіпрскіх банках спецыяльным падаткам у першую чаргу павінны былі пацярпець менавіта расійскія ўкладчыкі, якія сканцэнтравалі на кіпрскіх рахунках дзясяткі мільярдаў еўра.

Першы варыянт — абкладанне ўсіх дэпазітаў ва ўсіх кіпрскіх банках пэўным падаткам у залежнасці ад памеру дэпазіту — выклікаў сапраўдную паніку ў Расіі. Расійская біржа імкліва абвалілася на фоне падлікаў таго, колькі страцяць тыя або іншыя расійскія суб'екты гаспадарання, якія зарэгістраваны на Кіпры і захоўваюць свае грошы ў кіпрскіх банках, і ў цэлым расійскія ўкладчыкі. Абурыліся і ў Вялікабрытаніі, многія ўплывовыя людзі якой захоўваюць свае грошы на Кіпры. У выніку прынятых захадаў незадаволеных краін, у тым ліку і прамога дыпламатычнага ціску, 19 сакавіка парламент Кіпра адхіліў прапанаваны варыянт закона. Пачаліся новыя перамовы. Прэзідэнт і ўрад, разумеючы, што Еўрагрупа непахісная ў імкненні прымусіць кіпрскія ўлады ўсё ж абкласці дэпазіты спецыяльным падаткам, паспрабавалі атрымаць неабходны крэдыт у Расіі.

Важным козырам для Кіпра стала выяўленне вялікіх пакладаў газу ў яго прыбярэжнай зоне. Пакуль гаворка ідзе пра разведку і бурэнне першых свідравін, гэта значыць, якія-небудзь матэрыяльныя выгады ад эксплуатацыі радовішчаў будуць атрыманы толькі праз некалькі гадоў. Але, улічваючы хранічныя праблемы Еўрасаюза з уласнымі энергарэсурсамі, стратэгічнае значэнне Кіпра як важнага фактара ў вырашэнні праблем энергетычнай бяспекі ЕС адразу ж вырасла. Таму кіраўніцтва Кіпра паспрабавала прапанаваць ліцэнзіі на здабычу газу расійскім кампаніям для таго, каб атрымаць новыя крэдыты ад Масквы, але расійскае кіраўніцтва на гэта не пайшло. Запрошаная сума аказалася празмерна вялікай у параўнанні з далейшымі выгадамі ад здабычы газу.

У выніку Кіпру ўсё ж прыйшлося прыняць меры, здольныя сур'ёзна ўдарыць па яго прывабнасці для замежных укладчыкаў. Падатак на дэпазіты быў уведзены, праўда, для дэпазітаў звыш 100 тысяч еўра і толькі ў адным буйным банку. Прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў ахарактарызаваў гэту сітуацыя як рабаванне нарабаванага, намякаючы на тое, што грошы расійскіх укладчыкаў у кіпрскіх банках выведзены ад падаткаабкладання ў Расіі і часта маюць сумніўнае паходжанне.

Мараль таго, што адбылося на Кіпры, відавочная. Градус русафобіі ў ЕС працягвае знаходзіцца на высокім узроўні. Расіі неабходна рабіць з гэтага высновы. У прыватнасці, неабходна дэафшарызацыя эканомікі, пра якую нядаўна шмат гаварыў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Інакш грошы расійскіх фірмаў і ўкладчыкаў могуць падвергнуцца падобнай жа канфіскацыі і ў іншых краінах ЕС. Відавочнымі становяцца і плюсы беларускай сістэмы вядзення бізнэсу, пры якой афшоры практычна не выкарыстоўваюцца буйнымі структурамі.

Сяргей КІЗІМА,
загадчык кафедры міжнародных адносін
Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь,
доктар палітычных навук

■ Да ведама

ТЭРМІНЫ ЗАБАРОНЫ НА ЛОЎЛЮ РЫБЫ — БЕЗ ЗМЯНЕННЯЎ

На інтэрнэт-форумах зараз у рыбаловаў-аматараў тэма абмеркаванняў нумар адзін — умовы надвор'я, што склаліся, і ці адаб'юцца яны на магчымых пераносах тэрмінаў забароны на лоўлю рыбы.

Згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, вылаў усіх відаў рыбы ў сувязі з яе веснавым нерастам забараняецца з 1 красавіка па 30 мая (за выключэннем аматарскага рыбалоўства, што вядзецца рыбаловам адной вудай з адным кручком ці адным спінінгам, які мае штучную прынаду з адным адзінарным ці двайным, ці трайным кручком памерам не больш за № 10 па міжнароднай класіфікацыі №1, у светлы час сутак з берагу). Аднак, згодна з тымі ж Правіламі, у выпадку змянення ўмоў надвор'я, што ўплываюць на размнажэнне рыбы, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя можа прымаць рашэнне аб змяненні тэрмінаў забароны (як па ўсёй тэрыторыі краіны, так і ў асобных абласцях), не змяншаючы пры гэтым агульную працягласць забароны.

Вось рыбаловы-аматары і абмяркоўваюць таўшчыню снегавога покрыва, лёду на вадаёмах краіны, маўляў, які там нераст? З пытаннем, ці будуць зменены тэрміны веснавой забароны на лоўлю рыбы сёлета, мы звярнуліся ў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

— Ніякіх змяненняў у сувязі з умовамі надвор'я не плануецца, — паведаміла начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Наталля Мінчанка. — Забарона на лоўлю рыбы павінна ўступіць у сілу згодна з Правіламі.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

САДОВЫЯ ДОМІКІ ПЛАНУЮЦЬ ПЕРАВЕСЦІ Ў РАНГ ЖЫЛЛЯ

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 23 сакавіка.)

На пытанні чытачоў газеты падчас «прамой лініі» адказвае старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Георгій Кузняцоў.

— Адкажыце, калі ласка, што будзе з нашымі дачамі? Днямі чуў, што недзе ва ўрадавых структурах рыхтуецца рашэнне, па якім садовыя домікі можна будзе пераводзіць у ранг жылля. Ці праўда гэта? Калі гэта так, то калі і якім чынам падобнае будзе рабіцца?

Аляксандр Каруба, *г. Мінск.*

— Часткова вы маеце рацыю. Існуе парадак, калі мясцовыя органы ўлады могуць перавесці нежылы дом у ранг жылога. Потым магчыма змяніць мэтавае прызначэнне садовага зямельнага ўчастка пад зямельны масіў па абслугоўванні жылога дома. Гэта сапраўды так, але... У гэтым выпадку ў садаводчым таварыстве неабходна прывесці да ладу ўсе адпаведныя стандарты, неабходныя для якаснага функцыянавання сельскага населенага пункта.

— А хто павінен укараняць такія новыя стандарты?

— Гэтым павінны займацца мясцовыя ўлады. Неабходна ўдакладніць шырыню вуліц, стварыць капітальны водаправод, цывілізаваныя лініі электрапередач і гэтак далей. Далей існуе пытанне змены самога статусу такога садоўніцкага таварыства. На базе садоўніцкага таварыства трэба стварыць новы населены пункт або ўключыць гэтыя зямельныя ўчасткі ў склад бліжэйшага населенага пункта. Правядзенне такога мерапрыемства патрабуе даволі шмат часу і фінансавых сродкаў.

Існуе даручэнне гарвыканкамам паспрабаваць ажыццявіць такую «аперацыю» па пераводзе садовых таварыстваў у новы ранг. Нашаму камітэту зараз неабходна падрыхтаваць метадалогію (інструкцыю) па падобным пераводзе.

У межах горада Мінска існуе сёння садоўніцкае таварыства «Дражня». Там зараз каля 420 зямельных участкаў. У бліжэйшы час збіраюцца спрабаваць змяніць статус менавіта гэтага таварыства. У Мінскай вобласці існуе пасёлак Ждановічы, да якога магчыма далучыць бліжэйшыя садоўніцкія таварыствы. Гэта магчыма зрабіць, але спачатку неабходна атрымаць згоду на такое пераўтварэнне з боку ўсіх садаводаў.

— Паважаны Георгій Іванавіч, у мяне да вас такое пытанне. Мой брат у свой час атрымаў зямельны ўчастак у садоўніцкім таварыстве. Там пабудаваў летні домік. Аднак сам зямельны ўчастак ён так і не зарэгістраваў. Няўжо зараз яго могуць у брата канфіскаваць?

Іван Грынец, *г. Мінск.*

— Ніхто зямельны ўчастак у вашага брата адбіраць не будзе, калі ён там сапраўды займаецца садоўніцтвам, а ўчастак не пустуе. Але брату лепш афарміць такі ўчастак па законе. Зараз такі ўчастак пакуль нельга ні прадаць, ні нават падарыць. А яшчэ ў новага гаспадара могуць узнікнуць праблемы пры афармленні. Спадчыннікам вашага брата неабходна будзе афармляць такую нерухомасць праз суд. Цяпер зрабіць гэта будзе значна лягчэй.

— Калі трапіць у продаж другі том гістарычнага атласа Беларусі? Колькі ён будзе каштаваць?

Алесь Шыбіч, *г. Бабруйск.*

— Вялікі гістарычны атлас Беларусі ўяўляе сабой чатырохтомнае выданне, якое прысвечана гістарычнаму мінуламу і сучаснасці нашай краіны. Фаліянт дае шырокаму колу

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

грамадскасці поўнае і навукова выверанае ўяўленне аб гісторыі Беларусі. Першы том атласа адлюстроўвае найбольш раннія перыяды нашай гісторыі — ад старажытных часоў да сярэдзіны XVI стагоддзя. Гэты том быў падрыхтаваны і надрукаваны ў 2009 годзе.

Другі том атласа цалкам прысвечаны часу існавання Рэчы Паспалітай і адлюстроўвае перыяд ад Люблінскай уніі 1569 года да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе. Гэты том мае тры тэматычныя раздзелы. Першы з іх адлюстроўвае ваенна-палітычныя падзеі, другі — сацыяльна-эканамічнае развіццё, трэці — духоўнае жыццё, якое ўключае распаўсюджванне розных канфесій. Парадак, у якім размешчаны карты, прысвечаныя асобным канфесіям, адпавядае іх афіцыйнаму статусу ў Рэчы Паспалітай: каталіцкая царква, уніяцкая, праваслаўная, пратэстанцкая, рэлігіі галоўных этнічных меншасцяў. Як і ў першым томе, значную частку зместу другога дома атласа складае падборка рэпрадукцый старых картаў. Такія карты даюць магчымасць уявіць, якая інфармацыя аб беларускіх землях была агульнадаступнай адукаваным людзям у той час.

Другі том атласа стаў вынікам сумеснай творчай працы вядомых навукоўцаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Беларускага навукова-даследчага цэнтра электроннай дакументацыі і іншых навуковых арганізацый.

Цяпер другі том Вялікага гістарычнага атласа Беларусі знаходзіцца на ўзгадненні ў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. А выданне яго запланавана на другі квартал бягучага года. Кошт другога тома атласа будзе вызначаны пасля выпуску яго з друку.

Зараз пачалася праца па стварэнні аўтарскіх арыгіналаў картаў трэцяга тома атласа. Гэты том будзе прысвечаны перыяду знаходжання беларускіх земляў у складзе Расійскай імперыі, у тым ліку пачатку беларускага нацыянальнага руху.

— Ці створаны ў нашай краіне электронныя карты беларускіх земляў? Якім чынам такімі картамі можна будзе карыстацца?

Сяргей Лявошка, *г. Мінск.*

— У Дзяржаўным камітэце па маёмасці РБ на базе ўстановы «Дзяржаўны цэнтр картографа-геадэзічных матэрыялаў і звестак Беларусі» створаны дзяржаўны картаграфічны інтэрнэт-рэсурс maps.by. Гэты інтэрнэт-рэсурс сфарміраваны на аснове адкрытых для апублікавання электронных картаў тэрыторыі нашай краіны. Электронныя карты даступныя для бясплатнага прагляду і выкарыстання ў асабістых мэтах, за выключэннем зняцця копій, тыражавання і выкарыстання ў якасці асновы для стварэння картаграфічных твораў.

Для выкарыстання электронных картаў інтэрнэт-рэсурсу ў камерцыйных мэтах неабходна атрымаць дазвол на іх выкарыстанне ў Дзяржкаммаёмасці і заключыць ліцэнзійны дагавор з Дзяржкартгеацэнтрам. Дагавор заключаецца на падставе заявы па набыцці ў карыстанне электронных картаў, у тым ліку і ў электроннай форме. Тарыфы такіх паслуг па прадастаўленні электронных картаў вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Творцы

ТОЛЬКІ СВАЁЙ ДАРОГАЙ

Неяк самі сабой з памяці выплылі радкі, якія некалі мы, маладыя, цытавалі не стамляючыся: «Не важно, есть ли у тебя исследователи,\ А важно, есть ли у тебя последователи!..» Цытую, як яно выплыла... Сёння ўжо не зусім пагаджаюся з колішнім кумірам. Думаю, не так важна і першае, і другое. Важна, каб у цябе была дарога, і толькі свая, са сваімі прыпынкамі, верставымі слупамі, сваімі сябрамі, сустрэчнымі і спадарожнікамі, а самае галоўнае — са сваёй хадой.

Усё гэта важнае якраз ёсць у паэта Генадзя Пашкова. На паэтычным айчынным шматдарожжы я лёгка пазнаю, нават пункцірна ці гравюрна (яго ж слова) магу акрэсліць творчую сцяжынку слыннага паэта. Можна было ў гэтай хадзе і паўтарыць кагосьці, бо пачыналі мы ўсе быццам аднолькава... Па жыццёвай прыкідцы быццам бы і так. А па творчай — кожнаму жадалася свайго. У 1971 годзе мы сутыкнуліся з ім у калідоры Беларускага радыё, куды ён прыйшоў працаваць пасля заканчэння факультэта журналістыкі БДУ. Рэдакцыі нашы былі побач, праз сцяну. Недзе праз год Генадзя запрасілі на працу ў часопіс «Полымя», дзе ён затрымаўся надоўга — ажно на сямнаццаць гадоў.

У 1975 годзе Генадзь Пашкоў шчыра і нязвыкла частаваў нас свежасцю свайго «Кляновіка» — так называлася першая паэтычная кніга. Вельмі ж цёплая, сімвалічна дакладная назва. Такія ж цёплыя, з добрым маладым настроем, з павевам вобразнага «свежаку», узнёсла-пяшчотныя вершы... Было ў каго вучыцца. Сам «адмірал паэзіі» Анатоль Вялюгін, пад чыім службовым падначаленнем працаваў малады паэт, практыкаваў сапраўдныя ўрокі паэтычнага майстэрства. Рабіў гэта ненадакучліва, пераводзячы ўсё акадэмічна-халоднае ў ранг шчырага сяброўства. Вучняў сваіх ён скіроўваў на пакутніцкае здабыванне магічнага агню «спосабам Праметэя», нязмушана вучыў «трапнасці зроку і думкі, маштабнасці і ашчаднасці ў слове адзіна патрэбным».

Усялякае вучнёўства, вядома ж, некалі заканчваецца. Тады паэт пачынае жыць сваімі адкрыццямі, у звычайным шукаць незвычайнае.

Лірыка пад канец дваццатага стагоддзя патрабавала адметнасці. Ёй ужо мала было спагаднай лагоды, ціхасці ды замілаванасці, яна жадала і публіцыстычнай засяроджанай падфарбоўкі: «Аж задымеў асфальт!/ І гэта ўсё народу — / працэнты CO_2 / ды рэшткі кісларoду».

«Мы плацім за ацяпленне, ваду, каналізацыю. А потым прыходзіць перараслік — заплаціць за дадатковыя выдаткі. У ЖКГ растлумачыць, што гэта такое, не могуць. Чаму мы павінны аплачваць іх страты? — абураецца Георгій Вікенцьевіч. — Другое пытанне: мы кожны месяц плацім грошы на капрамонт. Але ў нашым пад'ездзе зрабілі проста агідны рамонт. А гэта ж грошы жыхароў. Мяне цікавіць: хто можа праверыць якасць выканання гэтых работ? І трэцяе пытанне, дакладней, просьба: звярнуць увагу на пад'езд да нашага дома. У нас наклалі бетонную падставу, але яна ўжо разбурылася. Ці можна нам дапамагчы адрамантаваць дарогу?»

І вось адказы дырэктара Стаўбцоўскага ГКС В.М. Шкляра:

1) Згодна з Інструкцыяй аб парадку разліку і зацвярджэння нарматываў расходу цеплавой энергіі (зацверджана рашэннем Мінаблвыканкама 05.05.2006 № 431), налічэнне платы за паслугі па падагрэве вады і ацяпленні жылых памяшканняў спажыўцам, якія пражываюць у жылых дамах, не абсталяваных прыборамі групавога ўліку расходу цеплавой энергіі, робіцца па нарматывах з улікам фактычнага расходу цеплавой энергіі на падагрэў 1 куб. метра вады і ацяпленне 1 кв. метра агульнай плошчы жылых памяшканняў, зацверджаных раённымі і гарадскімі выканаўчымі камітэтамі.


У Андрэя Судніка самая дакладная інфармацыя пра гарадскую гаспадарку.

У выпадку недабору (перабору) платы са спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг за ацяпленне жылых памяшканняў у жылых дамах, не абсталяваных прыборамі групавога ўліку, на працягу ацяпляльнага перыяду, пастаўшчыком паслуг у маі месяцы кожнага года робіцца перараслік платы па нарматывах з улікам фактычнага спажывання цеплавой энергіі за ацяпляльны перыяд, зацверджаны выканкамамі ў маі справаздачнага года».

Перараслік праводзіцца пасля завяршэння ацяпляльнага перыяду. У ліставідзе-снежні 2012 і студзені 2013 года перараслік за ацяпленне грамадзяніну Самахвалу Г.В. не праводзіўся.

2) У пад'ездзе № 2 д. 34 па вул. Свярдлова праводзіцца не капітальны, а касметычны рамонт. Адказным за ўчастак і якасць работ з'яўляецца майстар, адказным за складанне працэнтоўкі — работнік вытворча-тэхнічнага аддзела. Калі ў людзей ёсць якія-небудзь прэтэнзіі, яны могуць падысці да майстра. Акрамя таго, у ЖКГ маецца намеснік дырэктара па жылфондзе, які канцалюе такія работы.

3) Абследаванне вул. Свярдлова на прадмет добраўпарадкавання будзе праведзена пры спрыяльных умовах надвор'я да 15 красавіка 2013 года. Па выніках агляду будзе прынята рашэнне аб неабходнасці выканання работ.

БЕЗ ВАДЫ — НІ ТУДЫ І НІ СЮДЫ...

У час знаходжання ў Стоўбцах да нас звярнуліся жыхары з дзвюх суседніх вёсак — Налібак і Янкавіч з аднолькавай скаргай на дрэнную работу сельскага водаправода. *У Янкавічах, па іх словах, вада ў водаправодзе бывае толькі летам і нячаста, і чым далей ад воданапорнай вежы, тым слабейшы струмень, а бывае, наогул вады ў калонках няма тыднямі. У Налібаках жа, хоць водаправод рамантавалі зусім нядаўна, праблемы з вадой таксама здараюцца.*

— Па Налібаках сапраўды ёсць пытанні да будаўнікоў новай водаправоднай сістэмы, — адзначае **намеснік дырэктара Стаўбцоўскага АКС Андрэй СУДНІК.** — Праблема ў тым, што яны пры бурэнні глыбіннай свідравіны памыліліся з разлікамі. І ў «часы пік» яе магутнасці на ўсю такую вялікую вёску, як Налібакі, часам не хапае. Гэта паправяць, і хутка налібачане не будуць мець з вадой ніякіх праблем. Што тычыцца Янкавіч, там пытанне іншага кшталту. Водаправод у гэтай вёсцы наогул нідзе не значыцца. Ён быў калісьці самастойна зроблены сіламі мясцовага калгаса. Як гэта часта бывала — будавалі воданапорную вежу для жывёлагадоўчага комплексу, заадно працягнулі ад яе і трубу па вёсцы — вады не шкада, магутнасцяў хапала. Тады многія так рабілі. Але любая сістэма патрабуе догляду, асабліва з гадамі. Такую сістэму таксама трэба абслугоўваць. А магчымасці ў мясцовых гаспадарак ужо далёка не тыя. Не знайсці і дакументаў, разлікаў, па якіх вялося калісьці будаўніцтва. Таму цяжка нават вызначыць схему — дзе клаліся трубы ў зямлю і якія. Вось і ў Янкавічах такая сітуацыя. Але будзем разбірацца.

❍ ❍ ❍

Са сваёй бядой звярнуўся ў выязную прыёмную «Звязды» і **Дзмітрый НАВУМЧЫК:** *«Я буду ўся ў вёсцы Задвор'е. Сёлета збіраюся засяліцца, але там ёсць праблема з вадой. У пасёлку Усходні, які адносіцца да горада, летась падключылі ўсе камунікацыі. Размежаванне паміж гэтым пасёлкам і вёскай Задвор'е ідзе па дарозе: Задвор'е па адзін бок дарогі, пасёлак — па другі. Мы звярталіся з пытаннем, ці можна падключыцца да іх, але ЖКГ не дае дазволу, матывуючы тым, што не хапае ціску. Але нам хацелася б, каб вада была і ў нас. Практычна ўся наша вуліца без вады, свідравіна ёсць, але якасць вады пакідае жадаць лепшага: для бытавых патрэб гэтую ваду выкарыстоўваць яшчэ можна, а вось для пітва — не. Крыўдна: у гарадской мяжы ўсё праведзена за кошт дзяржаўных сродкаў, а ў нас няма нічога»*.

Але адказ намесніка **старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама Валерыя ФРАНЦКЕВІЧА** не ўзрадаваў: «На жаль, гэта не першачарговая тэрыторыя для правядзення вады. І ў сувязі з адсутнасцю фінансавых сродкаў у 2013-2014 гадах правядзенне водазабеспячэння там пакуль не плануецца».

❍ ❍ ❍

Затое адказ на пытанне **Аляксандра ЕРМАКА** гучыць больш аптымістычна. Аляксандр Антонавіч пацікавіўся: *«Год таму мне выдзелілі ўчастак пад будаўніцтва ў мікрараёне Паўночны-2. Але там няма ніякай інфраструктуры, камунікацый. Хацелася б даведацца, калі ўжо пачнецца будаўніцтва камунікацый»*.

Як паведаміў нам намеснік старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама Валерый Францкевіч, у бягучым 2013 годзе ў мікрараён Паўночны-2 плануецца падвядзенне электраэнергіі і добраўпарадкаванне дарогі. Таксама замоўлена праектная дакументацыя на падвядзенне газу і вады. Так што праблема ў хуткім часе абяцае быць вырашанай.

ЭХ, ДАРОГІ...

Сяргея БАРЫСЕНКУ трывожыць стан дарог у горадзе і, у прыватнасці, па вул. Сонечнай. *«Праехаць немагчыма, асабліва пасля дажджу. Прайсці — таксама праблема. Ямы па 25-30 см. Гэтае пытанне мы ўжо ўздымалі...»*, — паскардзіўся Сяргей Мікалаевіч.

Вольга Герман растлумачыла многія пытанні.

З адказу Валерыя Францкевіча вынікае, што гэтую вуліцу падсыпалі, яна грэйдуецца (іншымі словамі, разраўноўваецца) раз на месяц. У бліжэйшы час, пасля сходу снегу, вуліца будзе ў чарговы раз прагрэйдавана.

ВОКНЫ НА МОГІЛКІ

Алену ЯФІМАВУ хвалюе блізкае суседства са старымі гарадскімі могілкамі (размешчанымі па вул. Гайдука). *«У 80-х гадах могілкі закрылі, — сцвярджае Алена Аляксандраўна. — А зараз зноў хаваюць — ды пад самы плот. Капаюць магілы — у агарод сыплецца зямля... І чыста па-чалавечы непрыемна, і калі ўзяць медыцынскі аспект, то гэта таксама ненармальна...»*

У адказ прадстаўнікі Стаўбцоўскага АКС паведамілі, што могілкі па вул. Гайдука з'яўляюцца адкрытымі. Там вядзецца пахаванне сваякоў у раней зарэзерваваных месцах. Пахаванне праводзіцца ў межах могілак.

Прыватныя дамы там сапраўды ўшчыльную падыходзяць да могілак, распавялі нам і іншыя гараджане. Але ж людзі з самага пачатку ведалі, што будуць будавацца побач з могілкамі і што іх вокны будуць выходзіць на магілы. Калі людзі бяруць зямельныя ўчасткі — у гэты момант іх усё задавальняе і яны на ўсё згодныя. А потым з'яўляюцца прэтэнзіі... Можна зразумець і сітуацыю, калі на гэтых могілках пахавана дзіця, а яго маці зарэзервавала сабе месца побач з ім. Хто зможа адмовіць у такім пахаванні? Відаць, без кампрамісаў тут не абысціся. Так ужо склалася сітуацыя...

Святлана БУСЬКО.

Жыхарка Алена Яфімава: ці гэта норма, што могілкі побач з жылымі будынкамі?

■ Тры пытанні да ўлады

ІНВЕСТЫЦЫІ — ПОГЛЯД У ЗАЎТРА

Стаўбцоўскі раён — адзін з буйнейшых вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі Мінскай вобласці. Ён займае 4% у агульнай плошчы сельгасугоддзяў цэнтральнага рэгіёна, а доля раёна ў вытворчасці валавой прадукцыі абласной сельскай гаспадаркі трымаецца на ўзроўні 4,4 — 4,7 працэнта. Разам з тым, Стаўбцоўшчыну нельга назваць толькі аграрным рэгіёнам. Тут працуюць значныя прамысловыя прадпрыемствы, адкрываюцца новыя. Аб планах, надзеях, новых задумах у старшыні райвыканкама Уладзіміра МІСЬКО пацікавілася карэспандэнт «Звязды».

Старшыня Стаўбцоўскага райвыканкама Уладзімір Міско.

—Уладзімір Трафімавіч, у чым вы, як кіраўнік раёна, бачыце перспектыву развіцця Стаўбцоўскага краю? Над чым сур'ёзна працуеце цяпер?

— Перш за ўсё над пытаннем прыцягнення інвестыцый, адкрыццём новых вытворчасцяў. У рэгіёне намячаецца стварэнне трох даволі буйных прадпрыемстваў: па выпуску халадзільнага абсталявання (увод у дзеянне запланаваны сёлета), спецый, шклотары. На тэрыторыі раёна ёсць нядрэнныя ўчасткі для будаўніцтва прадпрыемстваў, дзе падведзены неабходныя камунікацыі, вада, электрычнасць. Актыўна шукаем інвестараў для іх асваення.

Акрамя таго, надзеі ўскладваем і на развіццё аграрнага комплексу. Хацелася б мець лепшы вынік ад нашых 14 сельгасарганізацый. За мінулы год, напрыклад, атрымалі нядрэнныя надоі — па раёне 5 450 кілаграмаў на карову. Паказчык вышэй за сярэдні па вобласці. Але, лічу, гэтага недастаткова: развежка ў надоях у гаспадарках даволі значная. У прыватнасці, у адных надаілі звыш 8000 кілаграмаў малака на карову, у іншых не дасягнулі і 4000 кілаграмаў. А хацелася б, каб яны выраўняліся, так бы мовіць, у адну ватэрлінію. Гэта наш прыбытак, значны артыкул папаўнення раённага бюджэту. Уявіце, кожны дзень раён пастаўляе на перапрацоўку 190 тон малака. З завяршэннем рэканструкцыі жывёлагадоўчых фермаў мяркуецца значна павысіць надоі. У нас ужо ёсць ферма, дзе даенне кароў ажыццяўляецца з дапамогай робата, у маі такую ж увядзём у адкрытым акцыянерным таварыстве «Каганец». У ААТ «Вішнявецкі-Агра» здадзены новы даільны зал на 24 месцы. Ужо сёння для фермаў набылі пускавыя комплексы, даільныя блокі, якія будзем манціраваць пасля таго, як жывёла выйдзе на пашу. Наша задача — наладзіць замкнуты цыкл атрымання прадукцыі.

Разам з тым, мы сутыкнуліся з праблемай здачы свіней. На мясакамбінаце прымаць адмаўляюцца, паколькі Расія ўвяла новыя стандарты. Справа ў тым, што па новых нормах сала павінна быць таўшчынёй не больш за два сантыметры. Але палка, як кажуць, з двума канцамі: у гэтым выпадку мы не атрымаем прывагі, якую ад нас патрабуюць.

У нас быў адзін з лепшых мясакамбінатаў у рэспубліцы, які даваў добры прыбытак у бюджэт раёна. Але цяпер ён стаў філіялам унітарнага прадпрыемства «Мінскі мясакамбінат». Так што бюджэтныя паступленні ад яго значна скарацілія. Безумоўна, хацелася б больш зарабляць у раённы бюджэт, які датуецца на 50 працэнтаў. Усё, што зароблена звыш, можна траціць на добраўпарадкаванне горада, вёсак. Таму яшчэ раз паўтарыся: сёння самае галоўнае для рэгіёна — інвестыцыі і развіццё прамысловасці.

— Зараз узяты кірунак на стварэнне буйных малочнатварных комплексаў. На вашу думку, малакамплектныя фермы сябе зжылі?

— Пачну з таго, што ў Стаўбцоўскім раёне налічваецца 201 населены пункт. Яны развіваюцца, як правіла, там, дзе цэнтр гаспадаркі — аграгарадок, дзе ёсць усё неабходнае для задавальнення бытавых, сацыяльных, культурных запатрабаванняў жыхароў: дзіцячыя садкі, школы, пошта, Дом культуры, быту, магазіны і іншыя аб'екты. Бываючы ў сельгасарганізацыях, даводзіцца чуць ад людзей наступнае меркаванне: «Няхай сабе возяць на работу, але я павінен жыць тут, дзе ёсць выгоды цывілізацыі».

У раёне налічваецца 15,5 тыс. кароў, з іх 14 тыс. 600 дойнага статка. У прыватных падсобных гаспадарках засталося 920 рагуль, за мінулы год іх паменела на 180. Лічу, што ў перспектыве трэба будаваць адну магутную ферму, дзе было б сканцэнтравана ўсё пагалоўе. А ўжо вакол такіх комплексаў развіваць усё астатняе. Так лягчэй пракантраляваць працэсы, якія адбываюцца. Напрыклад, у раёне можна зрабіць 3 комплексы. Наколькі ведаю, у адной з абласцей плануюць будаваць першы ў рэспубліцы «пяцітысячнік». У нашым раёне пакуль комплекс разлічаны на ўтрыманне тысячы кароў. Нікуды не дзенемся, прыйдзецца ўзбуйняцца і нам. Для гэтага існуюць аб'ектыўныя прычыны: скарачэнне працоўных рук у сельскай гаспадарцы.

— Наколькі адчувальны недахоп кадраў для вашага раёна, Уладзімір Трафімавіч?

— Паводле статыстыкі, на 1 студзеня 2013 года ў сельскай гаспадарцы раёна працуе 3651 чалавек. Без уліку птушкафабрыкі «Колас», дзе крыху больш за 500 чалавек, і «Племптушкарэпрадуктара «Бройлер», у аграрным сектары застаецца каля трох тысяч працаўнікоў. Для параўнання: у 1990 годзе іх было 11 тыс. 800.

Сёння ў нас практычна няма беспрацоўя. У цэнтры занятасці зарэгістраваны ўсяго 93 чалавекі. Работы хапае для ўсіх, але, на мой погляд, у гэтых людзей надта завышаныя патрабаванні. На жаль, шмат кадраў забірае сталіца, з якой добрыя транспартныя зносіны: хуткасная электрычка дамчыць туды за 40 хвілін. Працаваць даводзіцца з тымі людзьмі, якія ёсць. А трапляюцца розныя, у тым ліку і выпівохі. Кіраўнікоў арганізацый, прадпрыемстваў нацэльваю на тое, што на 95 працэнтаў вынік залежыць ад умення працаваць з чалавекам у індывідуальным парадку, яго зацікаўленасці ў канчатковых выніках — а значыць, і заробках.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,
■

■ Праблемы і рашэнні

І ЯШЧЭ — ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

Як сведчылі званкі, што паступілі падчас «выязной прыёмнай» у Стаўбцоўскім раёне, жыхароў рэгіёна хвалявалі не толькі асабістыя праблемы. Але, так бы мовіць, і больш глабальныя, якія тычацца жыццезабеспячэння горада, развіцця медыцыны, сацыяльнай сферы, стварэнне ўмоў для заняткаў фізкультурай і спортам. Мы абагульнілі ў адно цэлае тыя тэмы, якія сустракаліся найбольш часта.

ПРА КАМУНІЗМ... У МЕДЫЦЫНЕ

Віктар Пярхальскі, галоўны ўрач Стаўбцоўскай цэнтральнай раённай бальніцы:

— У Стаўбцоўскім раёне адчуваецца дэфіцыт медыцынскіх кадраў. Скажыце, калі ласка, якія меры прымаюцца, каб вырашыць праблему?

— Так, пэўны дэфіцыт кадраў у раёне ёсць. Напрыклад, налічваецца шэсць тэрапеўтычных участкаў, а тэрапеўтаў толькі чатыры. Менавіта яны і вядуць прыём на «вольных» участках. А гэта, як вядома, дадатковая нагрузка. Паводле штатнага раскладу, у нас павінны быць яшчэ 3 памочнікі ўрача. Але зараз іх толькі два. У жніўні па размеркаванні да нас прыедзе дзяўчына са Слуцкага медыцынскага каледжа, значыць, штат памочнікаў цалкам укамплектуем. У раённую паліклініку ўчастковым тэрапеўтам накіраваны выпускнік Гродзенскага медуніверсітэта. Сёлета заканчваюць вучобу два інтэрны, якія прымуць Налібоцкую і Цеснаўскую амбулаторыі і будуць працаваць урачамі агульнай практыкі. Мяркую, што кадравую праблему ў пярвічным звяне медыцынскай дапамогі (а гэта амбулаторыі, паліклінікі) мы закрыем на працягу гэтага і наступнага гадоў.

Мы рыхтуем і свае медыцынскія кадры. Адзін са студэнтаў вучыцца ў Віцебскім і яшчэ двое ў Гродзенскім універсітэтах па мэтавым накіраванні за кошт пазабюджэтных сродкаў раёна. Вядома, такім чынам можна было б падрыхтаваць і больш спецыялістаў для сістэмы аховы здароўя рэгіёна і цалкам закрыць кадравы голад. Але дазволіць такога раён не можа, паколькі яго бюджэт датуецца на 50%. У нас распрацавана праграма «Кадры», але яна прабуксуе, паколькі не хапае сродкаў на фінансаванне.

Я сам асабіста бываю на размеркаванні студэнтаў — медыкаў у сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах Беларусі, расказваю ім аб умовах працы, пражывання, аплаце. Кагосьці з іх наш раён цікавіць.

— Што ж могуць прапанаваць маладым спецыялістам у Стоўбцах?

На балансе цэнтральнай раённай бальніцы два інтэрнаты калідорнага тыпу, дзе пражываюць медперсанал. У пазамінулым годзе пабудавалі два каператыўныя дамы, там дзве кватэры прапанавалі менавіта маладым спецыялістам. Цяпер раённую стаматалогію перавялі ў новае месца, а ў старым будынку пасля рэканструкцыі плануем адкрыць сямейны інтэрнат блочнага тыпу. Але гэта ў перспектыве, паколькі толькі на распрацоўку праекта патрэбна кругленькая сума — 100 млн рублёў. Акрамя таго, па калектыўным дагаворы наймальнік выдзяляе спецыялістам тры базавыя велічыні — а гэта 300 тыс. рублёў — на аплату арэнды кватэры. Для райцэнтра гэта цалкам прымальны варыянт. Таму многія выпускнікі здымаюць прыватнае жыллё. Нашы маладыя спецыялісты, медыкі, не пакрыўджаны і ў заробках. Напрыклад, іх сярэдняя зарплата — пяць мільёнаў рублёў з улікам дадатковых выплат. Маладыя ўрачы, якія працуюць па кантракце, акрамя ўсяго, атрымліваюць яшчэ 50% ад тарыфнай стаўкі.

— Сёння вядзецца размова аб тым, каб людзі, якія трапілі ў бальніцу ў нецвярозым стане, самі плацілі за лячэнне. Як вы ставіцеся да такіх прапаноў?

Віктар Пярхальскі, галоўурач, дасціпна тлумачыў планы развіцця медыцыны ў раёне.

— Станоўча. У айчыннай медыцыне, я лічу, пануе абсалютны камунізм. Напрыклад, чалавек, які ўсё жыццё злоўжываў алкаголем і ў выніку «прапіў» пячонку, трапіў у рэанімацыю. Яму аказваецца такая ж самая бясплатная медыцынская дапамога, што і свядомаму грамадзяніну, ветэрану працы, які вялі здаровы лад жыцця, спраўна плацілі падаткі. А дзень знаходжання ў рэанімацыі аднаго пацыента каштуе бюджэту 1 млн 200 тысяч рублёў, выклік хуткай дапамогі — 350 тыс. рублёў. Мы імкнёмся данесці да жыхароў раёна, што нічога не бывае бясплатным. На жаль, далёка не ўсе гэта разумеюць. Вельмі часта злоўжываюць выклікам «хуткай». У асноўным гэта бездаказныя людзі, якія карыстаюцца сацыяльнымі дабротамі, хаця іх і не заслужылі. У дзень, у прыватнасці, бывае 35 выклікаў, з іх 5-6 фальшывых ці так званых «п'яных». Ёсць, напрыклад, у нас кліентка, якая патрабуе, каб да яе прыязджала толькі жанчына-фельчар, мужчыну ў дом не пускае. І з гэтай пераборлівай кабетай ніхто не можа саўладаць. На жаль, за такую сацыяльную разбэшчанасць і безадказнасць ніхто ніякай адказнасці не нясе.

...ДЭМАГРАФІЮ І СПОРТ

Сяргей Шэстэль, намеснік старшыні райвыканкама:

— Што ў раёне робіцца для ўмацавання спартыўнай базы? У прыватнасці, калі будзе ўведзены ў дзеянне фізкультурна-аздараўленчы комплекс?

— Для стварэння належнай матэрыяльна-тэхнічнай базы ў галіне фізічнай культуры і спорту за апошні час зроблена нямала. У мінулым годзе завяршыўся першы этап рэканструкцыі гарадскога стадыёна «Юнацтва», на футбольным полі ўкладзена штучнае пакрыццё, зроблены бегавыя дарожкі. Усяго затрачана 4 млрд рублёў. У гэтым годзе плануецца другая і трэцяя чарга работ. Тым больш, што футбольная каманда «Нёман — Агра» ўваходзіць у другую лігу чэмпіянату Мінскай вобласці. Неаднаразова нашы спартсмены станавіліся чэмпіёнамі вобласці ў сваёй лізе, а летась занялі другое месца. Дарэчы, разглядалася пытанне, каб гуляць у першай лізе, але ў гэтым выпадку патрабуюцца даволі вялікія ўзносы. Ды і на ўтрыманне каманды неабходна каля 2 млрд рублёў. Для нас сёння гэта нерэальна.

Значныя сродкі ўкладваюцца ў будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу. У мінулым годзе асвоена, напрыклад, 22,5 млрд рублёў. Сёлета плануецца асвоіць яшчэ 50 мільярдаў. Пастараемся да канца гэтага года ці на пачатку наступнага ўвесці яго ў эксплуатацыю.

— Закрыццё малакамплектных школ у вёсках стварае дадатковыя нязручнасці для жыхароў. Ці захаваецца тэндэнцыя надалей?

— На жаль, іншага шляху пакуль што няма. Закрыццё школ — не чыясьці прымха. Гэта аб'ектыўны працэс, які закрануў сістэму адукацыі рэспублікі, праблема дэмаграфіі. З кожным годам змяншаецца колькасць вучняў. З іншага боку, расходы на аднаго школьніка ў асобных установах даходзяць да 40 млн рублёў у год. Для параўнання ў Мінску на ўтрыманне навучэнцаў траціцца толькі 1,5 мільёна.

Сёння ў сістэме адукацыі раёна налічваецца 18 аўтобусаў, якія падвозяць дзяцей.

— На тэрыторыі раёна знаходзяцца два дамы — інтэрнаты для састарэлых. Яны моцна ўплываюць на паказчык дэмаграфічнай сітуацыі ў цэлым?

— У 2011-м у нас нарадзілася 506 дзяцей, а летась — 497. Але, нягледзячы на гэта, паказчык, які даведзены абласной праграмай, выканалі. Смяротнасць скарацілася на 2,8 працэнта. Гэта менш, чым прагназавалася. Але існуе аб'ектыўная прычына. На Стаўбцоўшчыне знаходзяцца два дамы-інтэрнаты для састарэлых — у вёсках Мікалаеўшчына і Куль, дзе адпаведна пражывае 333 і 505 чалавек. Летась тут памерла 89 пажылых людзей, а ў цэлым па раёне — 807.

Дэмаграфія складаецца з мноства фактараў: культура, эканоміка, медыцына, экалогія, умовы працы, адпачынку. Але на 50% здароўе чалавека залежыць ад яго самога, на 21% — ад спадчынных, генетычных фактараў, на 19% — ад экалогіі, на 9% — ад ўзроўню медыцыны. Мы стараемся вырашаць праблемы ў комплексе. Выдзяляем сродкі з раённага бюджэту для набыцця сучаснага медыцынскага абсталявання. У мінулым годзе выдаткі склалі каля 1 млрд 700 млн рублёў. Цэнтральная раённая бальніца закупіла, у прыватнасці, фібракаланаскоп, які дазваляе амаль імгненна правесці абследаванне і паставіць дыягназ.

Сістэма культуры нашага рэгіёна прадстаўлена 80 установамі. У мінулым годзе рэканструявалі першую чаргу гарадскога Дома культуры, зараз добраўпарадкуем фасад, прылеглую тэрыторыю. Сёлета працягнем работы і на аддзяленні харэаграфіі школы мастацтваў.

Што тычыцца магчымасцяў мясцовай улады, то яна ўсімі даступнымі сродкамі імкнецца фарміраваць здаровы лад жыцця, праводзіць шматлікія прафілактычныя акцыі, дні цвярозасці, абмяжоўвае продаж спіртных напіткаў і кантралюе іх ужыванне. На жаль, празмернае п'янства пакуль квітнее. І гэта асноўная прычына ўдзельнай вагі даволі высокай смяротнасці.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ
■

Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ВОПЫТ І ЎРОКІ ГІСТОРЫІ...

Аляксандр КАВАЛЕНЯ

Мікалай СМЯХОВІЧ

Сяргей ТРАЦЦЯК

Андрэй ЗЯБКО

Валерый ЯВАРОЎСКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нашы эксперты — тыя, хто прафесійна займаецца навуковым асэнсаваннем складаных і супярэчлівых падзей, якія разгарнуліся ў пачатку XX стагоддзя і прывялі да станаўлення беларускай дзяржавы — ад Беларускай Народнай Рэспублікі да Рэспублікі Беларусь:

Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар; Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, дырэктар Інстытута гісторыі НАН, кандыдат гістарычных навук; Мікалай СМЯХОВІЧ, загадчык Цэнтра гісторыі індустрыяльнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт; Сяргей ТРАЦЦЯК, загадчык аддзела найноўшай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук; Валянцін МАЗЕЦ, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт; Валерый ЯВАРОЎСКІ, загадчык цэнтра гісторыка-філасофскіх і карпаратыўных даследаванняў Інстытута філасофіі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт; Андрэй УНУЧАК, загадчык сектара гістарыяграфіі метадаў гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук; Андрэй ЗЯБКО, выкладчык Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка; Мікалай МЯТЛІЦКІ, галоўны рэдактар часопіса «Полымя», паэт; Юрый ЦАРЫК, намеснік дырэктара Дома прэсы, палітычны аналітык.

напярэдадні абвяшчэння БНР. Распачаты ваенны канфлікт перарос у сусветную крывавую бойню, прывёў да распаду чатырох імперый: Германскай, Расійскай, Асманскай, Аўстра-Венгерскай. Ён падштурхнуў у шэрагу ваюючых краін унутрыпалітычны крызіс і прывёў да рэвалюцыйных змен у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Становішча ў Расійскай імперыі ўскладнялася прадажнасцю, казнакрадствам чыноўнікаў і недальнабачнасцю палітычнай апазіцыі, якая ўзяла на ўзбраенне лозунг: «Чым горш — тым лепш». У выніку ўлада перайшла да той палітычнай сілы, якая заявіла аб выхадзе краіны з вайны, абвясціла зразумелыя і даступныя для простага, знясіленага чатырма гадамі вайны «чалавека з ружжом» лозунгі: «Далоў вайну!», «Далоў капітал», «Зямля — сялянам», «Фабрыкі і заводы — рабочым».

У рэчышчы размовы аб БНР хачу сказаць яшчэ пра адзін лозунг — аб праве нацый на самавызначэнне аж да аддзялення. Заўважым, што гэтая ідэя была папулярная не толькі сярод бальшавікоў, але і сярод мясцовых нацыянальна-дэмакратычных сіл, што і прывяло да развалу Расійскай імперыі. Гэтыя ідэйна-прапагандысцкія лозунгі бальшавікоў узмацнялі ўнутраны сацыяльны разлом і руйнавалі імператарскую армію.

Трэцяе: сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча на тэрыторыі беларускіх земляў. Чацвёртае: унутрыпалітычная барацьба і дзейнасць розных грамадска-палітычных плыняў, якія існавалі ў гэты час на тэрыторыі Расіі і ў першую чаргу ў нашым рэгіёне, заходніх губернях.

Сёння некаторыя палітыкі і гісторыкі ігнаруюць прынцып гістарызму. Прычым робіцца гэта асэнсавана. З гістарычнага кантэксту вырываюцца факты і падзеі для дасягнення асабістых мэтаў — палітычных ці сацыяльна-эканамічных. Мы, як гісторыкі, павінны сказаць, што абвяшчэнне БНР — гэта гістарычна абумоўленая падзея. Факт абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасць яе Рады — гэта была першая спроба не толькі прадэкларацыяваць, але і ажыццявіць практычныя захады ўтварэння беларускай дзяржаўнасці, што мае вялікае гістарычнае значэнне. Абвяшчэнне БНР аказала значны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, стала важным крокам далейшага дзяржаватворчага працэсу. Ад размоў аб фарміраванні беларускай ідэі мы прыйшлі да рэалізацыі гэтых ідэй. Ідэі за дзень не фарміруюцца, а ўзнікаюць дзякуючы таму, што было ўжо напрацавана ў грамадстве. Каб засведчыць шлях беларускага народа да сваёй дзяржаўнасці, Інстытутам гісторыі НАН выдадзена манаграфія «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» ў дзвюх кнігах, дзе з навуковага пункту гледжання даецца ацэнка гэтых падзей.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Адной з актуальных, стрыжнёвых праблем нашай гістарычнай навукі стала праблема даследаванняў беларускай дзяржаўнасці. І менавіта гэтым мы кіраваліся, калі ў 2005 годзе ў нас у Інстытуце быў створаны аддзел гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Аддзел на сённяшні дзень з'яўляецца каардынуючым цэнтрам па даследаванні праблематыкі гісторыі беларускай дзяржаўнасці для ўсіх навукоўцаў нашай краіны ў рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў. Менавіта нашымі акадэмічнымі вучонымі-гісторыкамі была распрацавана навуковая канцэпцыя аб тым, што ў гісторыі Беларусі існавалі гістарычныя і нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці. Гістарычныя формы, пачынаючы з X стагоддзя, якія былі на нашай тэрыторыі — гэта Кіеўская Русь, Полацкае, Тураўскае княствы. І нацыянальныя формы дзяржаўнасці: першая — Беларуская Народная Рэспубліка, пазней БССР і, нарэшце, Рэспубліка Беларусь. Гэта новае слова ў нашай гістарычнай навуцы. Да гэтага часу не было такой якасна абгрунтаванай канцэпцыі, якая дазваляе ўпарадкаваць формы дзяржаўнасці, якія існавалі на нашай тэрыторыі.

«Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» падрыхтавана ў адпаведнасці з нашай нацыянальнай ідэалогіяй. Мы выклалі матэрыял, гістарычныя факты так, як яны выглядаюць, калі падыходзіць да іх з аб'ектыўнага пункту гледжання, з пункту гледжання нас як народа, як нацыі беларусаў. Таму што мы лічым вельмі важным даводзіць да шырокай грамадскасці погляд на нашу гісторыю з пункту гледжання беларусаў. Калі мы гэта не будзем рабіць, то можам атрымаць польскі, украінскі, расійскі варыянт нашай гісторыі, а ў нас павінен быць уласны погляд на гістарычныя падзеі, якія адбываліся на нашай тэрыторыі.

Напрацоўкі Інстытута гісторыі па тэме беларускай дзяржаўнасці сёння актыўна ўключаюцца ў падручнікі і вучэбна-метадычныя дапаможнікі. З 2012 года мы пачалі чытаць спецкурсы ў ВНУ краіны па гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Сімвалічна: першая ВНУ, дзе мы пачалі такі спецкурс, — Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.

Андрэй УНУЧАК: Пытанне дзяржаўнасці вельмі шчыльна звязана з пытаннем існавання асобнага народа. Няма асобнага народа — няма пытання пра асобную дзяржаву, увогуле няма прадмету для размовы. Таму лідары беларускага нацыянальнага руху на пачатку XX стагоддзя займаліся сцвярджэннем гэтага факта ў грамадскай думцы Беларусі і ўвогуле ўсёй Расійскай імперыі: ёсць беларуская нацыя, якая мае свае палітычныя правы і галоўнае — права на ўласную дзяржаву. Галоўнымі асобамі беларускага нацыянальнага руху былі браты Луцкевічы, Іван і Антон, і Вацлаў Іваноўскі. Цэнтрамі руху — Санкт-Пецярбург, Вільня і Мінск. Пачыналася ўсё ў сталіцы Расійскай імперыі — Санкт-Пецярбургу, у 1902 годзе, на той момант у Пецярбургу жыло 70 тысяч беларусаў (калі меркаваць па тым, дзе людзі нарадзіліся, па веравызнанні, па мове)...



Адміністрацыйна-палітычная карта БНР, складзеная Аркадзем Смолічам, 1919 г.

Мікалай СМЯХОВІЧ: Трэба ўдакладніць, што дзяржаваўтваральныя працэсы і нацыяўтваральныя працэсы, якія пачаліся ў XIX стагоддзі, ішлі разам, а не паасобку. Дыялектыка такая: калі ёсць народ, то ён патрабуе рэалізаваць сваё права на дзяржаву. Калі няма дзяржавы, то няма і народа. І ў нацыяўтваральным працэсе маюць вялікае значэнне такія рэчы, як мова ці веравызнанне. Але самае важнае — стварэнне нацыянальнай эліты. А гэта не толькі палітычная эліта, гэта эліта эканамічная, культурная, навуковая. Кола нацыянальнай эліты можа быць вузкае. Але нацыянальная эліта праз барацьбу за нацыянальныя ідэалы, за рэалізацыю права беларусаў на сваю дзяржаву, за месца сваё ў арэале еўрапейскай геапалітыкі, рэалізоўвала думкі народа. Не трэба, каб увесь народ, усе сяляне ішлі стройнымі радамі са зброяй у руках. Ёсць прадстаўнікі, мовай якіх агучваюцца ідэі.

Андрэй УНУЧАК: Адметна, што пачынальнікі беларускага руху былі вельмі маладымі людзьмі. Напрыклад, на момант стварэння першай беларускай палітычнай партыі Вацлаў Іваноўскі, адзін з лідараў, меў 22 гады. Іван Луцкевіч — 21 год. Але арганізацыі пачынаюць стварацца вельмі хутка: «Клуб беларускай народнай асветы і культуры», пазней узніклае «Беларуская сацыялістычная грамада»...

На самым пачатку нашага адраджэння выключную ролю мела газета «Наша ніва». З 1906 да 1915 года выйшла каля 1 мільёна асобнікаў абодвума шрыфтамі (яна выходзіла да 1912 года кірыліцай і лацінкай, пасля — толькі кірыліцай). З гэтай газетай звязана падрыхтоўка грамадства ўвогуле да ідэі беларускай дзяржаўнасці, беларускай незалежнасці.

Стварэлася беларускія кнігарні, беларускі музычна-драматычны гурток, беларускія кааператывы і іншыя арганізацыі. Запачаткоўваецца класічная беларуская літаратура — Купала, Колас, Багдановіч, Гарэцкі. Фактычна на момант пачатку Першай сусветнай вайны ўжо была створана канкрэтная праграма. У праграме «Беларускай сацыялістычнай грамады» было заяўлена пра «краёвую аўтаномію». Мелася на ўвазе тэрыторыя сучаснай Літвы і Беларусі з сеймам у Вільні.

Сама «Наша ніва» ў 1913 годзе пісала: «Чаго ў нас няма?» І адказвала: самая прынцыповая рэч, якой не было — нацыянальная царква, пісалі яны. Нацыянальная царква — гэта ёсць сувязь паміж ідэяй і шырокімі масамі. Напрыклад, калі абвяшчалася літоўская незалежнасць, то пра яе людзі даведаліся, прыйшоўшы ў нядзелю ў касцёл. У нас гэтая праблема заставалася аж да канца Першай сусветнай вайны.

Аднак у тых умовах лідары беларускага нацыянальнага руху зрабілі ўсё, што ад іх залежала: факт існавання народа быў сцверджаны, заснаваны беларускі друк, беларускае выдавецтва, выпрацавалася беларуская літаратурная мова, акрэслены межы, сярод вайскоўцаў на фронце. Напярэдадні 1917 года значна змяніўся кадравы склад арміі, у акопах пераважна знаходзіліся салдаты, якія ў мірны час не праходзілі баявой падрыхтоўкі або наогул былі вызвалены ад воінскай службы. Іх матывацыя і баявы дух былі слабейшымі, чым у кадравых салдат, што ўзмацняла ў іх жаданне хутчэй скончыць вайну і накіравацца дадому. У арміі ў гэты час расце дэзерцірства, часцей здараюцца выпадкі адмаўлення ад выхаду на баявыя пазіцыі. Павялічваецца колькасць пісьмаў, дзе вайскоўцы выказваюцца аб нежаданні ваяваць. За 2,5 года людзі страшэнна стаміліся ад вайны, яны сталі негатыўна ставіцца да тых, хто яе развязаў, упаў прэстыж імперскага ўрада і самога імператара. Усё гэта стварыла ўмовы для розных альтэрнатыў далейшага развіцця.

Сяргей ТРАЦЦЯК: Беларускі нацыянальны рух таксама аказаўся расколатым вайной. Частка яго дзеячаў апынулася па германскі бок фронту, частка — па расійскі. Атрымалася так, што да 1918 года нацыянальна-палітычныя памкненні гэтых дзвюх груп — якія можна назваць віленскім і мінскім цэнтрамі — разыходзіліся. Віленская група адразу выставіла лозунг «Аднаўленне незалежнасці Вялікага Княства Літоўскага». Што датычыцца мінскай групы, то ў 1917 годзе, пасля лютаўскай рэвалюцыі, яна прапанавала лозунг «Аўтаномная беларуская рэспубліка ў складзе федэратыўнай дэмакратычнай Расійскай рэспублікі».

Трэба зазначыць, што дзеячы з Вільні і Мінска здолелі сустрэцца і дамовіцца аб тым, як дзейнічаць надалей. Арыентацыя на аднаўленне ВКЛ адышла ў мінулае. Трэба было думаць пра тое, як будаваць нацыянальную дзяржаву. А што яе прыйдзецца будаваць, было відавочна. І вось 25 сакавіка 1918 года, пасля доўгіх спрэчак, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі з удзелам прадстаўнікоў Беларускай рады Віленшчыны прымае Трэцюю Устаўную грамату да народаў Беларусі, у якой абвяшчае поўную дзяржаўную незалежнасць БНР у межах Магілёўскай, Мінскай, беларускіх частак Віцебскай, Віленскай, Гродзенскай, Смаленскай, Чарнігаўскай, і суседніх губерняў. На моцы гэтага, адзначалася ў Трэцяй Устаўнай грамаце, урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае ўвайсці ў зносіны з зацікаўленымі бакамі, прапануючы перагледзець тую частку «берасцейскага трактата», якая датычыць Беларусі, і падпісаць мірную ўмову з усімі дзяржавамі, што ваявалі. Рада БНР заяўляла, што Беларуская Народная Рэспубліка не была ўдзельнікам Першай сусветнай вайны і таму яна мае поўнае права заключыць адпаведныя дагаворы з усімі бакамі: як з краінамі Антанты, так з краінамі Чацвярнога саюза.

А далей атрымалася тое, што атрымалася. Беларуская Народная Рэспубліка не ўваходзіла ў планы германскай акупацыйнай улады. Акупанты беларускай Радзе перашкод не чынілі, але ўвесь час яскрава давалі зразумець: усё, на што яна можа разлічваць — гэта роля органа нацыянальнага прадстаўніцтва пры акупацыйнай адміністрацыі. Савецкі ўрад не жадаў прызнаваць Беларускую Народную Рэспубліку і тут ішоў насуперак сваім заявам, якія рабіліся дзеячам Усебеларускага з'езда перад яго скліканнем у снежні 1917 года: калі абвесціце незалежную беларускую савецкую сацыялістычную рэспубліку — то так яно і будзе... У тым геапалітычным становішчы, у якім у 1917-18 годзе апынуліся беларускія нацыянальна-палітычныя сілы, яны зрабілі максімум таго, што маглі: яны абвясцілі незалежную рэспубліку. Абвясціўшы незалежнасць Беларусі, яны задалі верхнюю планку, ніжэй якой сягаць ужо было нельга.

Мікалай МАЗЕЦ: Само абвяшчэнне, кажучы словамі Аляксандра Цвікевіча, аднаго з прадстаўнікоў урада БНР, «не шукае для сябе апраўдання, а сваім зместам сцвярджае спрадвечнае права народа Беларусі на волю. Дзякуючы акту 25 сакавіка Беларусь не стала незалежнай дзяржавай, але гэта не змяншае надзвычайнай гістарычнай вартасці гэтага акта і галоўнейшага закону беларускага вызваленчага руху. Ён не стаў законам, праведзеным у жыццё, але ён стаў законам беларускага жыцця».

І далей у тым жа самым артыкуле «Чатыры гады: 1918 — 1922» Цвікевіч піша: «Толькі беспасярэдняя воля народа, выражаная ў актыўным чыне, здольная стварыць трывалую дзяржаву. Калі такой волі няма, ці яна яшчэ недастатковая, то задача палітыкаў развіваць яе і ўсебакова культываваць». Гэта вельмі важная заўвага і для сённяшняга дня. Дзяржава тады трывалая, калі дзяржаўныя інстытуты падтрымліваюцца большасцю народа. Прадстаўнікі розных палітычных сіл абвяшчэнне БНР разглядалі як факт рэальны, крок неабходны, які дазволіць кансалідаваць усе народы, якія насялялі Беларусь, у дасягненні дзяржаўнасці і незалежнасці.

У гэтым напрамку якраз дзейнасць Рады БНР і Народнага Сакратарыята ў тых умовах была майстэрствам магчымага. Хачу звярнуць увагу, што на шляху інстытуалізацыі беларускай дзяржаўнасці ў тых вельмі складаных умовах зроблена было даволі шмат. Па-першае, на акупацыйнай тэрыторыі было адкрыта (па папярэдніх падліках) ад 150 да 250 школак. Дзейнічаў тэатр і гастраляваў па Беларусі!

Рада БНР і Народны сакратарыят прынялі спецыяльную інструкцыю, паводле якой праводзілі рэгістрацыю грамадзян Беларускай Народнай Рэспублікі. Удалося выявіць больш за 1000 такіх пасведчанняў. У архівах захавалася пасведчанне Народнага Сакратарыята БНР за №1042, выпісанае на імя Янкі Купалы. Акрамя таго, у 1918 г. у друкарні Язэпа Галеўскага ў Берліне быў выпушчаны агульнаграмадзянскі пашпарт Беларускай Народнай Рэспублікі, які складаўся з 12 старонак, а на вокладцы была выява дзяржаўнага герба. На атрыманне гэтых пашпартоў у Беларускім консульстве ў Адэсе запісалася каля 16 тысяч беларусаў, якія ваявалі тады на Румынскім фронце і жадалі вярнуцца дадому.

Акрамя іншага, праводзілася інстытуалізацыя БНР на месцах: ствараліся мясцовыя беларускія рады, яны фарміраваліся не па ўказанні немцаў, а ўзнікалі самастойна. Выяўлена таксама вялікая колькасць дакументаў, дзе сяляне звяртаюцца да Народнага Сакратарыята з просьбай абараніць ад гвалту з боку нямецкіх акупацыйных улад. Вялікую работу зрабіла бежанская камісія Рады БНР. Толькі на працягу ліпеня—лістапада 1918 года праз яе намаганні на радзіму праз Баранавічы вярнуліся 4 тысячы бежанцаў-беларусаў.

Разам з тым Беларуская Народная Рэспубліка была дзяржаўным утварэннем у стадыі фарміравання. Хоць БНР абвяшчалася ў межах этнаграфічнага рассялення беларусаў, але юрысдыкцыю на гэтай тэрыторыі не ажыццяўляла. Не было арміі, паліцыі, адсутнічала фінансавая сістэма. Сфарміраваная ўлада на месцах абмяжоўвалася прадстаўніцтвам пры акупацыйных уладах. Весці гутарку аб гарантыі правоў беларускага насельніцтва ва ўмовах акупацыі наогул немагчыма.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ

Валянцін МАЗЕЦ

Андрэй УНУЧАК

Мікалай МЯТЛІЦКІ

Юрый ЦАРЫК

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Сапраўды, формы ўлады БНР былі зародкавыя. Пры спрыяльных умовах яны маглі пераўтварыцца ў рэальную структуру. Але гэта ні ў якай меры не прымяншае важнасці і значнасці для нашай гісторыі самога факта абвяшчэння (упершыню за тысячагоддзі) права беларусаў на нацыянальнае самавызначэнне.

Мікалай СМЯХОВІЧ: Да 2011 года гісторыкі вялі гутарку аб тым, што БНР — гэта беларуская дзяржава, якую паспрабавалі стварыць дзеячы ў найскладанейшай геапалітычнай сітуацыі ва ўмовах Першай сусветнай вайны, а канкрэтна — у рэаліях Брэсцкага міру 1918 года. Вакол гэтага пытання разгортваліся гарачыя спрэчкі. Адны казалі: так, была беларуская дзяржава, іншыя: не, яна не адбылася. Сёння мы зусім па-іншаму разглядаем гэтыя пытанні. Мы вядзём гаворку пра тое, што БНР была нацыянальнай формай беларускай дзяржаўнасці. Гэта стала магчымым дзякуючы таму, што ў калектыўнай манаграфіі «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст.» упершыню ў беларускай гістарыяграфіі распрацавана і рэалізавана новая канцэпцыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

У чым сутнасць гэтай канцэпцыі? Мы ўпершыню катэгарыяльна вызначылі, што беларуская дзяржаўнасць — гэта права этнанацыянальнай супольнасці, патэнцыяльная здольнасць і магчымасць яе нацыянальнай эліты (палітычнай, эканамічнай, навуковай, культурнай) да працяглага самастойнага гістарычнага існавання. З гэтага вынікае: дзяржава — гэта канкрэтна-гістарычная форма ўвасаблення дзяржаўнасці ў часе і прасторы. Формы дзяржаўнасці могуць мяняцца, эвалюцыянаваць, але яна сама (дзяржаўнасць) заўсёды застаецца нязменнай. Вызначэнне зместу і сутнасці дзяржаўнасці — важнае навуковае адкрыццё, якім змогуць карыстацца прававеды, палітолагі, сацыёлагі, спецыялісты іншых галін ведаў. А нам, гісторыкам, гэта дало магчымасць прасачыць эвалюцыю і вызначыць формы беларускай дзяржаўнасці.

Азначэнне паняцця беларускай дзяржаўнасці дало нам магчымасць зусім па-іншаму паглядзець на ролю той нацыянальнай эліты, якая займалася справай стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі, і на ролю сённяшняй нашай нацыянальнай эліты.

Сама па сабе наяўнасць нацыянальнай эліты — яшчэ не гарантыя, што супольнасць зможа рэалізаваць сваё права на працяглае самастойнае існаванне і развіццё. Трэба, каб для гэтага былі інтэлектуальныя, палітычныя, фінансава-эканамічныя, інфармацыйныя і кадравыя рэсурсы.

95 гадоў таму беларускі народ здабыў сабе права на ўласную дзяржаву. Яго нацыянальная эліта валодала здольнасцю, неабходнай для ажыццяўлення гэтага права. Але канкрэтна-гістарычная геапалітычная сітуацыя не спрыяла нам. Немцы аб'ектыўна не маглі прызнаць БНР, яны тады казалі: «Няўжо нашы салдаты гінулі на ўсходнім фронце за тое, каб беларусы атрымалі сабе дзяржаву?» Савецкая Расія таксама была не зацікаўлена, каб ад яе аддзялілася частка тэрыторыі і ўзнікла дзяржава, якая можа стаць зусім не прыхільнай да новай улады.

Тым не менш абвяшчэнне БНР было лагічным працягам усяго нашага нацыянальна-вызваленчага руху і барацьбы за ўласную дзяржаву. У гэтым таксама вялікі гістарычны ўрок. Вы ведаеце, якія спрэчкі зараз вядуцца ў Расіі наконт таго, што такое патрыятызм. На мой погляд, маральны пастулат нашай нацыянальнай эліты змяшчаецца ў наступным: **«Дзе мая Радзіма — там мае грошы, мой дабрабыт — учора, сёння, заўтра!»** Гэта — прынцыпова новая пастаноўка пытання, тая лакмусавая паперка, па якой мы можам вызначаць, чые інтарэсы абараняе чалавек, які імкнецца да ўлады.

Аляксандр КАВАЛЕНЯ: Сапраўды, сёння ў моладзі набывае папулярнасць ідэя пра тое, што Радзіма там, дзе болей плацяць. Але ж гэта трагедыя для любой дзяржавы.

Мікалай СМЯХОВІЧ: Сёння, як і ў 1918 годзе, місіяй беларускай нацыянальнай эліты з'яўляецца здольнасць і надалей забяспечыць суверэннае развіццё беларускай дзяржавы на працяглы гістарычны перыяд. Дзеля таго, каб нацыянальная эліта здолела выканаць гэту сваю гістарычную місію (а інтэлігенцыя — неад'емная частка нацыянальнай эліты), мы і павінны весці навуковы аналіз якасці і месца інтэлігенцыі ў гэтым працэсе. А то мы мяркуем так: ёсць у нас палітычная эліта, хай яны прымаюць рашэнні, а мы збоку будзем стаяць і назіраць, крытыкаваць. Ад нас таксама залежыць прыняцце дзяржаўных рашэнняў.

Валерый ЯВАРОЎСКІ: Кожная дзяржава мае набор сімвалаў. Наша дыскусія паказала, што Беларуская Народная Рэспубліка — гэта сімвал, які трэба абараняць, у тым ліку з аб'ектыўна-гістарычнага пункту погляду. Савецкая рэальнасць знішчыла ўсялякія сляды гісторыі БНР. Стваральнікі БНР, якія вярнуліся з эміграцыі, былі расстраляныя, іх працы забытыя, і, па сутнасці, 20 апошніх гадоў нашай незалежнасці — гэта два дзесяцігоддзі разграбання руін, пошуку не толькі ўласнай сімволікі, але і правільнага стаўлення да яе. Так атрымалася, што Беларуская Народная Рэспубліка праіснавала нямат часу, але, як той казаў, мела доўгае жыццё пасля смерці.

Мікалай МЯТЛІЦКІ: Ёсць усімі намі любімая кветка — васілёк. Ён вельмі ярка сімвалізуе сённяшнюю нашу Беларусь. Гэты сімвал увайшоў у вершы сотняў паэтаў нашай Айчыны. А я вось думаю, з чым жа параўнаць БНР? З якой кветкай? Вы ведаеце, вось зараз снягі сыдуць, і на палянах лясоў нашых расцвіце сон, таксама вельмі блакітная, вельмі мімалётная ў часе кветка, якая будзе цвісці некалькі дзён, але вельмі памятная нам, беларускім дзецям вёскі, з нашага маленства. Дык вось, мне здаецца, што Беларуская Народная Рэспубліка вельмі падобна на гэту кветку. Яна сваёй настраёвасцю, сваім жаданнем супрацьстаяць холаду вырасла на зломе чатырох імперый, яшчэ раз нам, беларусам, падказаўшы, што стагоддзі працуюць на нашу суверэнную краіну, якая можа заняць годнае месца ў свеце. І, на наша шчасце, так адбылося.

Дык вось, сённяшні наш абавязак — ніколі не забываць тыя інтэлектуальныя, духоўныя сілы, якія нас з вамі спарадзілі. Можа, мы яшчэ не здолелі папулярна транслявать нашу гісторыю, яе малавата на тэлебачанні, там, дзе яна павінна быць даступнай. Яе часта падмяняюць, таму што мы недапрацоўваем і, на жаль, ёсць тыя, хто не хоча гэтай гісторыі чуць. Таму што ў сённяшнім разнасцежашым свеце нямногім хочацца быць прывязаным да свайго буслінага гнязда. Здаецца, там грошы на Кіпры паклаў, яшчэ дзе, лятаеш да часу, а калі недзе задымела, успамінаюць Бацькаўшчыну. Нельга забыць тое, адкуль ты выйшаў — гэтага васілька і вось гэтай сонтравы, якая расцвітае па вясне.

Мы не задумваемся, што цэментуем сваю дзяржаву перш-наперш сваім паважлівым стаўленнем да яе. І вось пакуль мы самі не ўзбудзім у сабе гэтае пачуццё, будуць у свеце такія галасы: вас ніколі не было, вы — міф! Але мы ёсць, беларуская дзяржава ёсць. Мы нікога не секлі, мы бараніліся і баранілі другіх, а сёння баронім нашу дзяржаву і перш-наперш імкнемся да таго, каб яна перамагала ў сэрцы кожнага з нашых суайчыннікаў.

Ларыса ЦІМОШЫК,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ОАО «Березовский КСИ»

Учетный номер плательщика: **200022939**
Вид экономической деятельности: **Производство стеновых блоков**
Организационно-правовая форма:
Открытое акционерное общество
Орган управления:
Юридическое лицо без ведомственной подчиненности
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **Брестская обл., Березовский р-н., Березовский с/с, 2, заводоуправление КСИ**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 года

Активы	Код строки	На 31 декабря 2012 года	На 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	337 819	322 143
Нематериальные активы	120	7	10
Доходные вложения в материальные активы	130		
Вложения в долгосрочные активы	140	901	1 284
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	-
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	63 053	63 927
ИТОГО по разделу I	**190**	**401 780**	**387 364**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	23 429	24 191
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	114	3 915
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	9 428	18 550
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	9 090	3 237
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	2 347	2 928
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**44 408**	**52 821**
БАЛАНС	**300**	**446 188**	**440 185**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2012 года	На 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	43 024	43 024
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	86	86
Добавочный капитал	450	113 973	58 452
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	(76 254)	(28 813)
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**80 829**	**72 749**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	117 345	110 517
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520		35 044
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	59	43
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**117 404**	**145 604**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	229 133	61 223
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	314	154 226
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	18 508	6 383
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660		-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**247 955**	**221 832**
БАЛАНС	**700**	**446 188**	**440 185**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2012 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2012 года	За январь–декабрь 2011 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	130 926	72 557
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	144 403	89 292
Валовая прибыль (010-020)	030	(13 477)	(16 735)
Управленческие расходы	040	15 471	-
Расходы на реализацию	050	11 393	4 117
